ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 344 (4750)
Аўторак, 29 сьнежня 1931 г.
МЕНСК, Савецкая 83

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ — Узмацніць барацьбу з ухіламі ў нацпытаньні (1 стар.). **А ДЖЭЛІОК, В. САМУЦІН** — Супроць трацкісцкага паклёпу на ленінскі камсамол і КП(б)Б (2 стар.). **І. ВЕРБА** — Мацней агонь па буржуазна-рэвацкіх тандэнцыях (3 стар.). **Г. ТЭКЛІН** — Шэйная прамысловасьць БССР да заключнага году пяцігодкі (3 стар.).

Спэцыялізацыя працы калгасьнікаў забясьпечвае гаспадарчы посьпех фэрмы калгасу імя Энгельса. Павысіць тэмпы апрацоўкі ільну. Да 1-га студзеня выканаць фінплян трэцяга рашаючага (1 стар.).

Да канца выкрыць трацкісцкіх кантрабандыстаў, нацыянал-ухілістаў і гнілых лібералаў да ўсякага фальсыфікатарства ленінізму. Да XIV зьезду КП(б)Б і XVII партканфэрэнцыі чырвонасьцяжны завод «Бальшавік» падыходзіць з вялікімі перамогамі (2 стар.).

XIV зьезд і XVII усесаюзную партканфэрэнцыю сустрэць ліквідацыяй запазычанасьці па нерэалізаваных рабочых прапановах. Апошнія навіны з фронту індустрыялізацыі (3 стар.).

КІТАЙ: Жорсткія баі на подступах Цзіньчжоу. (4 стар.).

УЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ З УХІЛАМІ Ў НАЦПЫТАНЬНІ

Апублікаваная пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні — дакумант найвялікшай палітычнай важнасьці.

Нацыянальнае пытаньне ва ўсёй гісторыі бальшавізму было і застаецца адным з асноўных і рашаючых пытаньняў пралетарскай рэвалюцыі.

Бальшавікі на чале з Леніным вялі самую ўпартую і суровую барацьбу супроць усіх і ўсякіх рэвізіяністаў, якія сказілі марксызм і ў нацыянальным пытаньні. Ленін непрымірыма зрываў маскі з апартуністычных прапаведнікаў рэакцыйнай «культурна-нацыянальнай аўтаноміі» і з кауцкіянцаў.

Бяз усякай літасьці Ленін выкрываў сацыял-патрыятызм і люксэмбургіянства ў нацыянальным пытаньні. Буржуазным і дробна-буржуазным націяналістам апартуністаў партыі бальшавікоў процідаставіла ленінскі лёзунг — права нацый на самавызначэньне аж да аддзяленьня.

«Поўнае роўнаправе нацый: права самавызначэньня нацый; зьліцьцё рабочых усіх нацый, — гэтай нацыянальнай праграме, — пісаў Ленін, — вучыць рабочых марксызм, вучыць вопыт усяго сьвету і вопыт Расіі». Ленін вёў рашучую барацьбу з усякім нацыяналізмам і ў першую чаргу з вялікадзяржаўным нацыяналізмам, з нацыяналізмамі пануючых нацый.

На аснове ленінскіх указаньняў партыя вырашыла нацыянальнае пытаньне. Партыя вядзе бязьлітасную барацьбу супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, бо гэты ўхіл «адбівае імкненьні адкываючых кляс панаваўшай раней вялікарускай нацыі вярнуць сабе страчаныя прывілеі» (Сталін).

Партыя непрымірыма змагаецца супроць ухілу да мясцовага нацыяналізму, супроць прымірэнцтва да ўхілаў у нацыянальным пытаньні.

КП(б)Б, няўхільна ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, дабілася найвялікшых перамог па ўсіх франтох сацыялістычнай будоўлі. Нашы перамогі—гэта турбіны Асінбуду і машыны Гомсельмашу, гэта новыя індустрыяльныя гіганты і магутныя прамысловыя камбінаты. Нашы перамогі — гэта бальшавіцкія тэмпы культурнай рэвалюцыі і ўвядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня, гэта пасьпяховае ператварэньне БССР у рэспубліку суцэльнай пісьменнасьці.

Пры брацкай дапамозе пралетарыяту Савецкага Саюзу расьце і мацнее індустрыялізацыя БССР, тэмпы якое перавышаюць агульна-саюзныя. У калгасах Савецкай Беларусі—50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Калгаснае сялянства стала цэнтральнай фігурай вямляробства.

Гэтыя перамогі дасягнуты па аснове цьвёрдага правядзеньня генэральнай лініі нашай партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі. Яны заваяваны ў жорсткай барацьбе супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, найбольш небясьпечнага на даным этапе, у барацьбе супроць беларускай контррэвалюцыі — нацыянал-дэмакратаў і нацыянал-апартунізму, супроць шавінізму ўсіх масьцей і адценьняў.

У барацьбе за зьнішчэньне кляс наша партыя перамагае шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў. Буржуазныя і дробна-буржуазныя ўплывы маюць месца ня толькі ў радох рабочай клясы, але і ў паасобных зьвеньнях партыі. Клясавы вораг і яго агенты вышукваюць самыя рознастайныя формы супраціўленьня разгорнутаму наступленьню сацыялізму. Зброяносцы трацкізму — перадавога атраду контр-рэвалюцыі, — разьбітыя ў адкрытым баі, прабуюць «праз браму гісторыі» працягнуць сваю трацкісцкую кантрабанду, выкарыстоўваючы налітычную сьлепату паасобных камуністаў, паражаных гнілым лібералізмам.

Трацкісцкія фальсыфікатары гісторыі нашай партыі пралазяць у розныя шчыліны, каб адтуль весьці барацьбу з ленінізмам і ў нацыянальным пытаньні, прыкрываючыся сьцягам люксэмбургіянства.

Патрэбна асабліва пільнасьць, асабліва непрымірымасьць кожнага камуніста да ўхілаў у нацыянальным пытаньні і прымірэнцтва да іх і, перш за ўсё, да ўхілаў у бок вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі.

Гэта задача з усёй сілай падкрэслена ў пастанове ЦК і ЦКК КП(б)Б аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні. Яе значэньне тым больш узрастае, што ў КП(б)Б нэўны час мела месца неправільная ўстаноўка, якая трактавала нацыянал-дэмакратызм, як галоўную небясьпеку, што за апошні час заўважаецца актывізацыя ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму.

І да сёньняшняга дня некаторыя партыйныя зьвеньні не зразумелі, што найбольш небясьпечным ухілам на даным этапе зьяўляецца ўхіл да вялікадзяржаўнага шавінізму, не разгарнулі бязьлітаснай барацьбы з вялікадзяржаўнымі ўхілістамі. У цэлым радзе выпадкаў некаторыя партыйныя арганізацыі праяўляюць гнілы лібералізм у адносінах да вялікадзяржаўных ухілістаў, не даюць своечасовага і рашучага адпору канкрэтным праяўленьням ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму.

Рад вылазак наглядна ілюструе актывізацыю вялікадзяржаўных ухілістаў. Паасобныя вучоныя і літаратары (Выдра, Вальфсон і інш.) выступаюць з крытыкай нацыянал-дэмакратызму з пазыцый яўных вялікадзяржаўных ухілістаў, процідаставіць нацыянальную форму культуры яе пралетарскаму зьместу. Трацкісцкі кантрабандыст Югаў падзяляе камуністаў на вялікарускіх, беларускіх, украінскіх і г. д., распальваючы нацыянальны антаганізм. На радзе прадпрыемстваў і ва ўстановах Гомелю і Віцебску вялікадзяржаўныя ўхілісты адкрыта выступаюць супроць беларусізацыі, не сустракаючы заўсёды патрэбнага адпору.

Факты апартуністычнай недаацэнкі нацыянальнага пытаньня, аслабленьня барацьбы з вялікадзяржаўнымі ўхілістамі і прымірэнцтвам да іх настойліва асабліва патрабуюць рашучага ўзмацненьня самай суровай і непрымірымай барацьбы супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, найбольш небясьпечнага на даным этапе. ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове ва ўсю вышыню ставяць перад усёй КП(б)Б важнейшую палітычную задачу:

«... павысіць пільнасьць да вылазак і праяўленьняў вялікадзяржаўнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і арганізаваць яшчэ больш актыўную барацьбу з ім, наносячы рашучы ўдар па апартуністычным і абывательскім прымірэнцтве да вялікадзяржаўнага ўхілу».

КП(б)Б разьбіла ў адкрытым баі нацыянал-дэмакратызм і жорстка змагалася з нацыянал-апартунізмам. Наша партыя да канца выкрыла контррэвалюцыйную сутнасьць прапаведнікаў «адзінства беларускай нацыі», якія здрадай і шкодніцтвам пад сьцягам «адраджэньня самабытнай Беларусі» рыхтавалі пад камандай польскага фашызму і нацыянал-фашызму імпэрыялістычную інтэрвэнцыю супроць нашай краіны. Партыя нанесла руйнуючы ўдар па нацыянал-апартуністычных агентах нацдэмаўскай контр-рэвалюцыі, гэтых нацыянал-дэмакратах з партбілетамі ў кішэнях.

КП(б)Б цалкам правільна правяла барацьбу з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам. Перамогі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР былі-б немагчымымі без «рашучай барацьбы КП(б)Б з усімі праяўленьнямі апартунізму і шавінізму, у тым ліку без пасьпяховай барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і яго нацыянал-апартуністычнай агентурай у радох партыі» (з настановы ЦК і ЦКК КП(б)Б аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні).

«Зьвязда» вяла самую жорсткую барацьбу супроць контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў і іх нацыянал-апартуністычных агентаў. Гэтым тлумачыцца тая зьвярыная нянавісьць, тое шалёнае выцьцё, з якімі нацыянал-дэмакраты і нацыянал-апартуністы вялі сваю кампанію супроць «Зьвязды». Аднак, у радзе сваіх артыкулаў па нацпытаньні «Зьвязда» ў 1929 г. дапусьціла памылковук ўстаноўку, якая акрэсьлівала нацыянал-дэмакратызм, як галоўную небясьпеку на даным этапе.

У артыкуле «Аб правым ухіле ў КП(б)Б у нацпытаньні» (27 ліпеня, 1929 г.) зацьверджаным бюро ЦК КП(б)Б, «Зьвязда» пісала:

«... мы павінны асноўны агонь накіраваць на наступальны шавінізм і нацыянал-дэмакратызм. Мы павінны мабілізаваць вакол пытаньняў узрастаючай небясьпекі ўсіх відаў нацыяналізму і шавінізму, асабліва беларускага, як найбольш небясьпечнага на даным этапе».

Гэты няправільны лёзунг знайшоў сабе месца і ў пастановах XIII зьезду КП(б)Б аб прафсаюзах. Трактаваньне беларускага нацыянал-дэмакратызму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, было яўна няправільнае. Яно супярэчыла выразным настановам X і XII зьездаў РКП(б) і XVI зьезду УсесКП(б), якія падкрэсьлівалі, што галоўнай небясьпекай у нацыянальным пытаньні зьяўляецца ўхіл у бок вялікадзяржаўнага шавінізму. Гэта была бязумоўна памылка, ня гледзячы на тое, што КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК, вяла ўвесь час рашучую барацьбу з вялікадзяржаўным ухілам.

КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, неадкладна пасьля XVI зьезду выправіла гэту памылковую ўстаноўку. ЦК адразу завастрыў увагу ўсёй КП(б)Б, усіх камуністаў на самай бязьлітаснай і непрымірымай барацьбе супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як найбольш небясьпечнага на даным этапе. ЦК у радзе сваіх пастаноў (кастрычніцкі пленум і г. д.), у выступленьнях кіраўнікоў КП(б)Б, у радзе артыкулаў «Зьвязды» і іншых газэт і ва ўсёй практычнай рабоце вёў бязьлітасную барацьбу з вялікадзяржаўным ухілам.

Фальсыфікатары і рознага роду рэвізоры гісторыі нашай партыі, карыстаючыся памылковай установкай аб галоўнай небясьпецы, ня раз прабавалі ўзяць пад сумненьне палітычную лінію КП(б)Б у барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам. Партыя дала бязьлітасны адпор вядомай палітычнай спэкуляцыі «левага» апартуніста Ганіна, які адкрыта праз друк прабаваў дыскрэдытаваць барацьбу КП(б)Б і яе ЦК з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Такі-ж адпор сустрэнуць і ўсякія іншыя рэвізоры і фальсыфікатары. КП(б)Б верна правяла барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам і апартунізмам, разграміўшы беларускую контр-рэвалюцыю і нанёсшы сакрушальны ўдар па яе нацыянал-апартуністычных агентах.

Контр-рэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм і нацыянал-апартунізм разгромлены, але яны ня зьнішчаны. Яны праяўляюцца ў тых ці іншых формах і змагаюцца супроць партыі і яе ленінскай нацыянальнай палітыкі. Шчарбакоў, Разэнблюм, Майзэльс, Шапавалаў, Поташ і інш. працягваюць кантрабандай старыя, знаёмыя ідэйкі нацыянал-дэмакратызму і ідэалізуюць Бунд, БСГ.

Партыя дасьць руйнуючы адпор трацкісцкім, нацыяналістычным кантрабандыстам і надалей, вядучы непрымірымую барацьбу з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і ўхілам у бок беларускага шавінізму і шавінізмам усіх іншых адценьняў, у якіх-бы формах яны не праяўляліся.

Зганьбаваны, ушчэнт апаганены сьцяг містэра Троцкага — безнадзейная зброя для яго паплечнікаў. Трацкісцкія і поўтрацкісцкія кантрабандысты і фальсыфікатары падхапляюць ідэі люксэмбургіянства, каб пад гэтай маскай працягваць сваю контр-рэвалюцыйную кантрабанду. Фальсыфікуючы гісторыю, яны ідэалізуюць люксэмбургіянства, як «артадаксальны марксызм», старанна абыходзячы яго антыленінскую, антыбальшавіцкую пазыцыю ў цэлым радзе карэнных пытаньняў пралетарскай рэвалюцыі.

Люксэмбургіянства падхапляецца вялікадзяржаўнымі ўхілістамі і нацыянал-апартуністамі, якія, прыкрываючыся імем Р. Люксэмбург, прабуюць рэвізаваць ленінізм у нацыянальным пытаньні. Ленін увесь час вёў самую бязьлітасную барацьбу супроць памылак люксэмбургіянства, якое «сваім адмаўленьнем права нацый на самавызначэньне ў праграме расійскіх марксыстаў, дапамагае на справе чорнасоценцам-вялікарусам». Ленін рашуча падкрэсьліваў, што пазыцыя Р. Люксэмбург і яе прыхільнікаў у нацыянальным пытаньні «дапамагае на справе апартуністычнаму прымірэньню з прывілеямі (і горш, чым з прывілеямі) вялікарусаў». Адмаўляючы права нацый на самавызначэньне, люксэмбургіянства дапамагала разгулу самага чорнасоценнага вялікадзяржаўнага шавінізму і выкідвала за борт рэвалюцыйнай барацьбы такі магутны рэзэрв рэвалюцыі, як прыгнечаныя народы калёній і поўкалёній. За люксэмбургіянства, — як пісаў Ленін, — «чапляюцца апартуністы ўсіх нацый».

Партыя зруйнуе контр-рэвалюцыйны манэўр трацкісцкіх і меншавіцкіх кантрабандыстаў і нацыянал-ухілістаў рэвізаваць ленінізм пад сьцягам люксэмбургіянства. Ва ўмовах КП(б)Б барацьба супроць ідэалізацыі люксэмбургіянства набывае асабліва сур'ёзнае значэньне. Кожны камуніст павінен дасканала ўявіць сабе ўсю шкоднасьць і памылковасьць погляду люксэмбургіянства ў нацыянальным пытаньні.

Палітычная важнасьць гэтай задачы яшчэ, аднак, не ўсьвядомлена ў паасобных зьвеньнях КП(б)Б. Цэнтральная польская газэта «ОркА» знайшла магчымым ня толькі не разгарнуць ніякай барацьбы з люксэмбургіянствам, але нават проста вамаўчаць ліст тав. **Сталіна** ў рэдакцыю «Пролетарской революции», не перадрукаваць прамовы тав. Кагановіча.

Палітычная памылка «Оркі» — сур'ёзная перасьцярога. Задача кожнага камуніста — узьняць сваю клясавую пільнасьць, аўладаць тэорыяй марксызму-ленінізму, каб быць заўсёды гатовым даваць рашучы адпор усякім трацкісцкім і меншавіцкім фальсыфікатарам, усякім кантрабандыстам, якія пад сьцягам люксэмбургіянства працягваюць свае контр-рэвалюцыйныя тэорыйкі.

КП(б)Б трымала і моцна будзе трымаць сьцяг ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б яшчэ больш узмацніць непрымірымую барацьбу з усякімі ўхіламі ў нацыянальным пытаньні і прымірэнцтвам да іх, у першую чаргу супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі. У барацьбе за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку, КП(б)Б даб'ецца новых перамог у справе будаўніцтва культуры — пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме.

СПЭЦЫЯЛІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ КАЛГАСЬНІКАЎ

ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ ГАСПАДАРЧЫ ПОСЬПЕХ ФЭРМЫ КАЛГАСУ ІМЯ ЭНГЕЛЬСА

ПАВЫСІЦЬ ЗДАЧУ ТАВАРНАЙ ПРАДУКЦЫІ

Малочна-таварная фэрма калгасу імя Энгельса, Уваравіцкага раёну, за 8 месяцаў свайго існаваньня ўжо дабілася значных посьпехаў па камплектаваньні стада і ўзьняцьці яго прадукцыйнасьці.

671 штука, у тым ліку 393 дойных каровы, 100 пяцелей ад 2 да 3-х год, 50 шт. маладняка ад 1 да 2 год, 98 цялят да 1 году і 30 вытворнікаў—вось пагалоўе фэрмы. Большасьць яго знаходзіцца ў цэнтры калгасу—ў былой вёсцы **Радзеева.** Тут у двух новых сьветлых аборах, якія скончаны будаўніцтвам у кастрычніку, размешчана 400 шт. Рэшта—знаходзіцца ў спэцыяльна прыстасаваных сялянскіх хлявох. Зараз ударнымі тэмпамі заканчваецца будаўніцтва трэцяй аборы яшчэ на 100 шт.

Радзеева—цэнтр фэрмы. Тут 16 даярак і 16 скотнікаў даглядаюць 400 шт., 12 даярак ужо маюць 2-хгадовы стаж работы, 11 з іх прэміраваны ў веснавую сяўбу за тое, што спраўляліся са сваёй асноўнай работай на фэрме і дапамагалі калгасу на палявых работах.

Даяркі і скотнікі ўжо напамяць ведаюць распарадак работы на фэрме, які вывешан тут-жа на сьцепах у двух аборах.

У 5 гадзін раніцы пачынаецца клапатлівая работа на фабрыцы малака. Кожная даярка ведае сваю групу ў 10 кароў (цяпер даюць толькі 160 шт.). Адна за аднэй падыходзяць даяркі да бідона, выліваюць літрам малако і рапартуюць: «Пашуля»—1,0, «Бяняжка» — 1,0, «Вэнта»—1,5, «Птушка»—2,5.

Вучотчыца Маня ўжо ведае аб чым ідзе гутарка. Яна запосіць у кнігу ўдой кожнай каровы.

Летам да кожнай даяркі было прымацавана па 15-17 кароў, якіх даілі па 3 разы ў суткі. Зараз да кожнай прымацавана па 10 кароў, якіх даюць толькі два разы ў дзень. Апрача гэтага кожная даярка абавязана раздаць корм 25 каровам, прымацаваным да яе. Корм загатаўляецца і падвозіцца скотнікамі.

За работу даярцы залічваецца 1¼ працадзень.

Практыка мінулай зімы, калі з прычыны неэканомнага расходваньня і разбазараньня кармоў, у канцы зімы ня было чым карміць жывёлу, паслужыла добрым урокам для калгасу.

Гэту зіму малочная фэрма сустрэла падрыхтаванай.

Каб забясьпечыць стада кармамі па ўвесь стойлавы пэрыяд, на фэрме эканомна выдаткоўваюць кармы, строга прытрымліваючыся норм—на адну дарослую карову штодзенна адпускаецца 2,25 клг. сена, 2,1 клг. саломы і 2,5 клг. сакавітых кармоў (сілас—бульба). Цялятам адпускаецца: 1 клг. сена, 1½ клг. саломы, ½ клг. сакавітых кармоў. Для падсьцілу на кожную штуку адпускаецца ў суткі ня больш 1 клг. саломы.

Увядзеньне норм,—заяўляе загадчык фэрмы тав. **Барысёнак,**—дае магчымасьць забясьпечыць стада кармамі на ўвесь стойлавы пэрыяд. За выдаткаваньнем кармоў наладжан строгі кантроль. Раней чым напоўніць кармушку, даярка кладзе кармы на вагу і толькі пасьля кантролю вагаўшчыка дзядзі Цімоха, нясе іх жывёле.

У бліжэйшыя дні на фэрме ўстанаўляюцца рацыёны для пэўных груп жывёлы. Гэта дасьць магчымасьць пры большай эканоміі кармоў дабіцца ўзьняцьця ўдойнасьці.

Рад істотных недахопаў яшчэ тармозіць узьняцьце таварнасьці фэрмы. Галоўным недахопам зьяўляецца тое, што налічвае прыдзён даяркам і скотнікам робіцца толькі ад колькасьці кароў, што абслугоўваюцца імі, і зусім ня ўлічваецца колькасьць надоенага кожнай даяркай малака. Бязумоўна, гэта адбілася на ўдойнасьці кароў і здачы таварнай прадукцыі. Здана дзяржаве 68.990 літраў малака—крыху больш 50 проц. пляну.

Барацьба за якасьць работы, за ўзьняцьце таварнасьці фэрмы—зьяўляецца зараз першачарговай задачай праўленьня калгасу імя Энгельса. Увядзеньне прагрэсыўна-прэміяльнай аплаты працы даярак і скотнікаў у залежнасьці ад надоенага малака, бязумоўна, палепшыць якасьць іх работы і ўзьніме таварнасьць жывёлагалоўлі—асноўнай галіны сельскай гаспадаркі калгасу.

Б. Харытончык.

Калгаснае стада за бясьпечваецца у другую чаргу

ШКЛОЎ (Наш кар.)

У калгасах імя Леніна і імя Валадарскага ў выдаткаваньні кармоў папуе поўная абязьлічка. Дагэтуль ня вылучана асоба, якая-б адказвала за кармы. У выніку—у першую чаргу кармамі забясьпечваецца жывёла, якая знаходзіцца ў індывідуальным карыстаньні калгасьнікаў і ў другую чаргу—калгаснае стада.

У калгасе імя Леніна для кароў, якія знаходзяцца ў індывідуальным карыстаньні калгасьнікаў, выдаецца па 16 цнт. сена і капошыны, а ў калгасе імя Валадарскага—па 8 цнт.

Калгасная жывёла не забясьпечана кармамі нават на зімовы пэрыяд. Хлявы, дзе знаходзіцца абагуленае стада, не ацеплены.

Толькі ліквідацыя абязьлічкі ў выдаткаваньні кармоў, бязьлітасная барацьба з іх разбазараньнем і вынішчэньне кармовых рацыёнаў дасьць магчымасьць забясьпечыць аграмаднае стада кармамі на ўвесь стойлавы пэрыяд.

НОВІКАЎ.

Прэміяваньне лепшых работнікаў сьвінаводчых фэрм

Перадавыя калгасы БССР да тэрміну выканалі пляны здачы таварных сьвіней дзяржаве.

Калгас «Пэўны шлях», Шклоўскага раёну, здаў дзяржаве 133 сьвіньні —170,5 проц. заданьня, калгас «Шлях сацыялізму», Клімавіцкага раёну, здаў 48 сьвіней—137,1 проц. пляну, камуна «Чырвоны барацьбіт» здала 45 сьвіней—136,4 проц. Калгас «Чырвоны партызан» (Крычаўскага раёну) з 150 шт. на пляне, ужо здаў 139; камуна «Хлеб і вада», Горацкага раёну, з 150 шт.—ужо здала 124.

Праўленьне Калгасцэнтру БССР за датэрміновае выкананьне і перавыкананьне плянаў здачы таварнай прадукцыі пастанавіла прэміяваць лепшых калгасьнікаў і калгасьніц, працуючых на сьвінаводных фэрмах гэтых калгасаў. Для прэміяваньня ўдарнікаў і лепшых работнікаў фэрм адпушчана на 565 руб. прамтавараў і 650 руб. грашыма.

Павысіць тэмпы апрацоўкі ільну

КОЖНАЙ МЯЛЦЫ—ПОЎНУЮ НАГРУЗКУ

Правільна арганізаваць работу

Апартуністычны самацёк, адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва і масавай палітычнай работы і асабліва дрэнная арганізацыя апрацоўкі ўсё яшчэ тармозяць ільназагатоўкі ў радзе раёнаў БССР.

Да гэтага часу тэмпы першапачатковай апрацоўкі ільну і пянькі ня ўзьняты. Разрыў паміж апрацоўкай і здачай не ліквідаваны.

Абсьледваньнем ЦКК-НК РСІ выяўлена, што ў некаторых раёнах ня складзены пават пляны апрацоўкі, якія прадугледжвалі-б правільную арганізацыю працы, устанаўленьне цьвёрдых тэрмінаў апрацоўкі, выкарыстаньне ўсіх тэхнічных магчымасьцяй і г. д.

Толькі злачынствам можна кваліфікаваць такі факт, калі ў паасобных раёнах (Старобін) машыны ляжаць па складах райкаапсаюзу, у той час, як калгасы адчуваюць у іх вялікую патрэбу.

У радзе калгасаў **Дубровенскага, Лепельскага, Дрысенскага, Вушацкага раёнаў** ільнамальныя машыны не пагружаны, або зусім не выкарыстоўваюцца.

У выніку дрэнная арганізацыі работы, далёка недастатковаму укараненьню зьдзельшчыны агульны плян першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель на 20 сьнежня выканан па БССР па мяцьці на **45,1 проц.,** па трапаньні ўсяго на **24,2 проц.**

Загатоўчы апарат замест таго, каб быць арганізатарам першапачатковай апрацоўкі ільну і забясьпечыць праверку і інструктаж у большасьці не займаецца гэтай важнейшай справай.

Трэба узьняць тэмпы апрацоўкі. Адначасова з мабілізацыяй усяго паяўнага інвэнтару трэба дабіцца максымальнага яго выкарыстаньня. **Кожная мялка павінна атрымаць поўную нагрузку. Абязьлічка і бясплянавасьць не павінны мець месца ў рабоце па першапачатковай апрацоўцы.**

Дабіцца штодзеннага нарастаньня тэмпаў апрацоўкі, не дапусьціць разрыву паміж апрацоўкай і здачай ільну дзяржаве — баявая задача ўсіх партыйных і загатоўчых арганізацый.

„Дняпроўскі ўдарнік" працуе не па-ўдарнаму

ДУБРОЎНА. Калгас «Дняпроўскі ўдарнік» цягнецца ў хвасьце ільназагатовак. Да гэтага часу апрацавана ўсяго толькі 3 цэнтр., частка ільну нават не абмочана.

Брыгады па апрацоўцы ільну ня складзены. Рабочы па мяцьці і трапаньні не пераведзены па зьдзельшчыну.

«Дняпроўскі ўдарнік» павінен быць узят на буксір перадавымі калгасамі Дубровенскага раёну.

Прымайце выклік!

ДУБРОЎНА.

Калгас «Араты», Кляпоўскага сельсавету, выканаў плян ільназагатовак на 70 проц., апрацоўка ільну заканчваецца.

Калгасьнікі абавязаліся змагацца за добраякасную апрацоўку і лепшае валакно здаць (прадаць) дзяржаве.

Калгас «Араты» выклікае на сацспаборніцтва па хутчэйшай апрацоўцы і здачы ільну дзяржаве калгасы «Бальшавік», імя Варашылава, «Іскра», «Чырвоны чырынец».

Калгасы Дубровенчыны, прымайце выклік!

З. С. Б.

Манэўр клясавага ворага выкрыт

ЛЁЗНА. Выкананьне пляну ільназагатовак па **Лёзьнянскім раёне** праходзіць нездавальняюча. На 20-га сьнежня заданьне рэалізавана на 51,4 процантаў.

Загатоўчыя арганізацыі ня прымаюць мер да фарсаваньня ільназагатовак. Стаўка на самацёк не ліквідавана.

Многія парт'ячэйкі на мясцох яшчэ не ўсвядомілі кіраўніцтва гэтай адказнейшай гаспадарча - палітычнай кампаніяй.

Ільнамяльныя пункты працуюць з перабоямі. Так, у калгасе **«Пражэктар»** тры ільнамяльных пункты працуюць у адну зьмену і то з прахладцам—у тры дні раз.

Бязьдзейнасьць загатоўчых арганізацый выкарыстоўвае кулак, які імкнецца сарваць ільназагатоўкі. Кулакі **Пчолка** і **Гаўрыленка,** якія пралезьлі ў калгас «Камбайн» з мэтай разлажыць яго з сярэдзіны, адкрыта выступалі на сходах, агітуючы за зрыў ільназагатовак і разьмеркаваньня валакна паміж калгасьнікамі. Кулацкі манэўр быў, аднак, выкрыт калгасьнікамі, якія пастанавілі выключыць кулакоў з калгасу і ў адказ на манэўр клясавага ворага поўнасьцю здалі лён дзяржаве.

Вопыт калгасаў «Авангард», «Іскра» і інш., якія дабіліся датэрміновага выкананьня заданьняў сведчыць аб поўнай рэальнасьці пляну і магчымасьці выканаць яго ў тэрмін.

Раённыя арганізацыі павінны ўзмацніць наступленьне на кулацкія элемэнты, разгарнуць масавую работу сярод калгасьнікаў і адпаасобнікаў і дабіцца ліквідацыі запазычанасьці Лёзьнянскага раёну дзяржаве.

Л. С.

КАЛГАС „МАЯК САЦЫЯЛІЗМУ" ДАБІЎСЯ ПЕРАМОГІ

ВУШАЧЫ. (БЕЛТА). **Калгас «Маяк сацыялізму» перавыканаў пляны па здачы (продажу) ільнавалакна дзяржаве. Ільна-трасты здана на 30 цнтн. звыш пляну.**

Калгас дабіўся гэтых посьпехаў у выніку пераходу на брыгадны мэтад работы і ўвядзеньня зьдзельшчыны.

ДА 1-га СТУДЗЕНЯ ВЫКАНАЦЬ ФІНПЛЯН 3-га РАШАЮЧАГА!

Узяць прыклад з перадавікоў

З кожным днём расьце сьпіс гарадоў і раёнаў, якія, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, на аснове шырокага разгортваньня масавай работы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, грамадзкага буксіру, мабілізацыі шырокіх рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас, паказалі сапраўды бальшавіцкія ўзоры барацьбы за фінплян, датэрмінова выканаўшы і перавыканаўшы заданьні па мабілізацыі сродкаў. Гэта — Менск, Гомель, Віцебск, Сіроціна, Бабруйск, Жыткавічы.

Падыйшлі да амаль поўнага выкананьня пляну Магілеў, Заслаўе, Асіпавічы, Сянно і рад іншых раёнаў.

Перадавыя гарады і раёны не павінны ні ў якім разе аслабляць тэмпаў работы. Наадварот, неабходна яшчэ з большай энэргіяй і энтузіязмам дабівацца ўзмацненьня тэмпаў, асабліва па добраахвотных плацяжох.

Усе іншыя раёны, і ў першую чаргу адстаючыя, павінны мабілізаваць увесь актыў на выкананьне сваіх пляноў.

Прыйсьці да IV апошняга году пяцігодкі з перамогай на фінансавым фронце — баявая задача пралетарскай грамадзкасьці.

Менск паказаў узоры бальшавіцкай работы

На 20-га сьнежня Менск, другім па БССР, выканаў плян мабілізацыі сродкаў 4-га кварталу, даўшы 103,3 проц. заданьня.

Перамога Менску на фінансавым фронце лішні раз падкрэсьлівае рэальнасьць пляну і наносіць руйнуючы ўдар па апартуністах, яныціках і малаверах.

Толькі там, дзе кіраўніцтва ня стала на чале ўздыму актыўнасьці мас, ня ўзялося па-бальшавіцкаму за работу, ня случыла мабілізацыю сродкаў з іншымі гаспадарча - палітычнымі кампаніямі, выпікі выкананьня фінпляну нездавальняючыя, і важнейшыя дырэктывы не выжыцьцёўлены.

Менск у пачатку сьнежня адставаў ад перадавых раёнаў. Пасьля 10 сьнежня ён хутка перабудаваў работу па штурмавыя тэмпы пад лёзунгам: «Рапартаваць сэсіі ВЦК СССР аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў».

У барацьбу за фінплян быў уцягнут шырокі актыў рабочых, калгасьнікаў і адпаасобнікаў Меншчыны. Рабочыя заводу імя Варашылава, першымі выканаўшыя свой плян мабілізацыі сродкаў, узялі на буксір адсталыя прадпрыемствы, паслаўшы туды ўдарныя брыгады. Завод вылучыў на дапамогу НКФ дзьве брыгады, выехаўшыя ў адсталыя раёны. За заводам імя Варашылава пасьледавалі «Камунар», «Кастрычнік», якія ў сваю чаргу ўзялі на буксір адсталых. Брыгады, што выехалі ў раёны, дапамагалі вясковаму актыву разгарнуць масавую работу, зьбіраць калгасы, вёскі, паасобныя двары.

Калгас Кайкаўскага сельсавету, ажыцьцявіўшы свой плян, узяў на буксір калгас Караліншчаўскага сельсавету. Дзякуючы ўдарнай рабоце, абодвы калгасы заняли перадавыя месцы ў радох барацьбітоў за фінплян.

Вялікі энтузіязм праявілі калектывы саюзу фінансава-банкаўскіх работнікаў, вылучыўшыя да 200 ударнікаў, якія па-баявому працавалі ў горадзе і выяжджалі ў раёны.

Перамога была забясьпечана, дзякуючы таму, што гарадзкая партыйная арганізацыя, гарком камсамолу і гарпрафсавет правільна кіравалі барацьбой за фінплян, мабілізавалі актыў, давалі канкрэтныя і выразныя дырэктывы.

Самымі адсталымі вучасткамі застаюцца дагэтуль МЦРК і жыльлёвая каапэрацыя, якія ня здолелі перабудавацца па-хаду і па-ўдарнаму мабілізоўваць сродкі. Гэтыя вучасткі трэба ўзяць пад пеаслабны кантроль.

Менск паказаў добрыя прыклады фінансавай работы, якія павінны быць пашыраны на іншыя раёны.

П. Саратаўкін.

КААПЭРАЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ МЕНСКУ—САМЫ АДСТАЛЫ ВУЧАСТАК МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

Пленум фінансава - падатковай сэкцыі Менгарсавету абгаварыў пытаньне аб выкананьні фінпляну за 4-ты квартал. Прызнаўшы агульны процант выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў здавальняючым, пленум падкрэсьліў, што каапэрацыйныя арганізацыі ганебна адстаюць у адносінах збору паёў і ўкладаў. Па Менскім ПРК і ЗРК плян паднакапленьня выканан толькі на 72,8 проц.; па райспажыўсаюзе па 36,4 проц.; па сыстэме Осдгародсаюзу —на 48,5 проц. Гаржылсаюз, які ўзяў на сябе абавязак ліквідаваць запазычанасьць па паёх і кватэрнай плаце не пазьней 20

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ДА КАНЦА ВЫКРЫВАЦЬ ТРАЦКІСЦКІХ КАНТРАБАНДЫСТАЎ, НАЦЫЯНАЛ-УХІЛІСТАЎ

і гнілых лібэралаў да ўсякага фальсыфікатарства ленінізму

РЭЗАЛЮЦЫЯ сходу актыву Менскай арганізацыі КП(б)Б па дакладу тав. Гея аб лісьце тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі „Пролетарская революция" і задачах барацьбы за партыйнасьць у тэорыі

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б), у жорсткай клясавай барацьбе, даючы бязьлітасны адпор правым і «левым» апартуністам і прымірэнцтву да іх, партыя дабілася буйнейшых сусьветна-гістарычных перамог па шляху разгорнутага па ўсім фронце сацыялістычнага наступленьня — з посьпехам завяршыла пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Уступілі ў строй новыя магутныя гіганты сацыялістычнай індустрыі — новы «АМО», харкаўскі трактарны завод, заканчваецца Магнітабуд, Кузьнецкабуд і г. д.

У БССР, як неадрыўнай частцы ўсяго Савецкага Саюзу, шпарка растуць новыя буйныя фабрыкі і заводы (Гомсельмаш, Сталінбуд, крычаўскі цэмэнтны завод і інш.), што паляпшае рады пралетарыяту і яшчэ больш узьнімае вядучую ролю сацыялістычнай прамысловасьці ў народнай гаспадарцы нашай рэспублікі.

СССР зьяўляецца краінай самага буйнога ў свеце зямляробства. Працуючыя сёлы часаў і калгасаў стала пераможнай. У барацьбе за цэнтральную вязачу ў калгасным будаўніцтве — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, у барацьбе за выкананьне 6-ці гістарычных умоў т. Сталіна мы атрымліваем новыя перамогі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Бальшавіцкае выкананьне 6-ці умоў тав. Сталіна ўжо стварыла карэнны пералом у вугальнай і мэталюргічнай прамысловасьці і забясьпечвае перамогу на іншых участках сацыялістычнай буйоўлі.

Значна паляпшаецца матар'яльнае і культурна-бытавое абслугоўваньне рабочае клясы, калгасьнікаў і працоўных мас.

Карэным чынам зьмяніліся суадносіны клясовых сіл у краіне. Значна ўзрасла колькасьць рабочае клясы, павялічваюцца рады энтузіястаў сацыялістычнай працы — ударнікаў. Калгасьнік стаў цэнтральнай фігурай зямляробства, асноўнай і моцнай апорай савецкай улады на вёсцы. На базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя апора капіталізму ў нашай краіне — кулацтва як кляса.

Ленінскае пытаньне «хто-каго» канчаткова вырашана ў карысьць сацыялізму.

Клясовы вораг, якога мы выбіваем з апошніх пазыцый, упарта супраціўляецца разгорнутаму па ўсіх франтох пераможнаму наступленьню сацыялізму.

Агентура клясавага ворага ў радах партыі — правыя і «левыя» апартуністы — шкодзіць аслабіць жалезнае адзінства нашай партыі, і тым самым сьпіхнуць яе з ленінскага шляху, сарваць пабудову сацыялізму.

Бальшавізм вырас і загартаваўся ў бязьлітаснай барацьбе па два фронты — супроць усялякіх праяўленьняў апартунізму.

Бязьлітасная барацьба на два фронты — супроць правага апартунізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да іх, барацьба з рэцыдывамі контрэвалюцыйнага трацкізму, з яго кантрабандным працягваньнем, з праяўленьнямі гнілога лібэралізму зьяўляецца асноўнай умовай пасьпяховасьці будаўніцтва сацыялізму.

Фронт тэарытычнай барацьбы зьяўляецца адным з важнейшых участкаў клясавай барацьбы. Барацьба з усялякага роду апартунізмам на тэарытычным фронце на сучасным этапе набывае разьвіцьця набывае буйнейшае, актуальнае значэньне.

Партыя разгарнула клясава-варожыя тэорыі і «тэорыйкі» на ідэалёгічным фронце (рубіжнічыцтва — у палітэканоміі, дэборынічыцтва — у філёсофіі, шкаверзэўнічыцтва і варонічыцтва — у літаратуры, мэханіцызм і г. д.).

Барацьба на ідэалёгічным фронце за марксыцка-ленінскую тэорыю — матарыялістычную дыялектыку, супроць мэханіцызму, які зьяўляецца тэарытычнай базай правага ўхілу, супроць меншавіцтвуючага ідэалізму, які ў асноўным зьяўляецца тэарытычнай базай сацыял-фашызму і контрэвалюцыйнага трацкізму — першачарговая задача ўсёй партарганізацыі, кожнага камуніста ў паасобку.

Агульна-гарадзкі сход партактыву горача вітае своячасовае выступленьне правадыра партыі т. Сталіна ў часопісі «Пролетарская революция», якое мабілізуе ўсю партыю на непрымірымую барацьбу з працягваньнем контрэвалюцыйнай трацкісцкай кантрабанды, з праяўленьнямі гнілога лібэралізму, з усялякага роду скажэньнямі марксызму-ленінізму.

Сход актыву падкрэсьлівае, што ліст т. Сталіна мае вялізарнейшае тэарытычнае і палітычнае значэньне для ўсяго тэарытычнага фронту, усёй партыі і ўсяго міжнароднага рэвалюцыйнага руху.

Ліст т. Сталіна з усёй рашучасьцю і бальшавіцкай непрымірымасьцю выкрывае спробы рэнэгатаў марксызму-ленінізму прадставіць поўцэнтрысцкі сьцяг люксэмбургізнства, як сапраўднае марксыцкае вучэньне і, выкарыстоўваючы рэвалюцыйныя заслугі Розы Люксэмбург, адцягнуць масы пралетарыяту на Захадзе ад бальшавіцкага кіраўніцтва Камінтэрну, ад пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Ліст т. Сталіна рашуча патрабуе ад кожнага бальшавіка асабліва прынцыповых партыйных адносін да ўсіх тэарытычных пытаньняў і перш за ўсё да пытаньняў гісторыі бальшавізму. Адсэтуль увага ўсёй партыі і тэарытычных кадраў павінна быць сканцэтравана на бальшавіцкай пільнасьці і барацьбе з гнілым лібэралізмам, які скарыстоўваецца трацкісцкімі кантрабандыстамі для сваіх контрэвалюцыйных мэт.

Трацкісты прабуюць весьці барацьбу супроць бальшавізму-ленінізму шляхам фальсыфікацыі гісторыі бальшавізму, шляхам адмаўленьня сусьветнай ролі бальшавізму і яго кіраўніцтва міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі і адмаўленьня непрымірымай барацьбы яго з усімі відамі апартунізмаў і прымірэнцтва на прапягу ўсяго існаваньня бальшавіцкай партыі.

Партактыў з усёй сілай падкрэсьлівае, што «трацкізм зьяўляецца перадавым атрадам контрэвалюцыйнай буржуазіі... Вось чаму лібэралізм у адносінах да трацкізму, хоць і разьбітага і замаскаванага, ёсьць галавацяцтва, якое мяжуе са злачынствам, са здрадай рабочай клясе» (Сталін).

Партактыў патрабуе ад усіх парторганізацый, ад кожнага камуніста ў паасобку ўзмацненьня бязьлітаснай барацьбы за партыйнасьць у рабоце, рашучага ўскрыцьця ўсялякіх праяўленьняў контрэвалюцыйнага трацкізму і яго кантрабанды, усіх памылак, якія льюць ваду на млын трацкізму, ускрыцьця і барацьбы з усялякага роду ухілаў, якія ідуць на карысьць трацкізму.

Адзначаючы цэлы рад фактаў, выяўленых за апошні час у Менскай арганізацыі, якія адбіваюць ігнараваньне нацыянальных асаблівасьцяй, мовы, культуры, быту і нацыянальнай формы з боку часткі апарату і нават камуністаў, — партыйны актыў патрабуе ўзмацненьня работы па беларусізацыі; пры гэтым партактыў падкрэсьлівае правільнасьць пастановы ЦК, якая папярэджвае, «што абмежкваньню задач па беларусізацыі адным толькі вывучэньнем беларускай мовы зьяўляецца недаацэнкай нацпытаньня і што справа сапраўднага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі заключаецца ў аўладаньні партыйнай арганізацыяй і рабочай клясай усімі працэсамі нацыянальна-культурнага будаўніцтва (тэарытычны фронт, літаратура і творчасьць) (пастанова ЦК ад 25-XII 31 г.).

Актыў лічыць патрэбным прапрацаваць пастанову ЦК і ЦКК ад 25-га сьнежня г. г. ва ўсіх парт'ячэйках Менскай арганізацыі і ў сетцы партасьветы.

Сход партыйнага актыву заклікае ўсю Менскую арганізацыю КП(б)Б да яшчэ большага павышэньня бальшавіцкай пільнасьці, згуртаваньня партыйных радоў на аснове генэральнай лініі партыі і ўзмацненьня работы па марксыцка-ленінскім выхаваньні арганізацыі, асабліва новых папаўненьняў.

Менская арганізацыя прыходзіць да сваёй 2-й гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі, да XIV-га зьезду КП(б)Б і XVII-ай канфэрэнцыі УсеКП(б) манолітнай і згуртаванай на аснове ленінскай лініі партыі, будучы вернай апорай ЦК.

За генэральную лінію партыі!

Супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да іх!

За рашучае выкрыцьцё і выгнаньне контр-рэвалюцыйных трацкісцкіх кантрабандыстаў, за выкрыцьцё і барацьбу з гнілым лібэралізмам, як абавязковую ўмову ажыцьцяўленьня 5-цігодкі за 4 гады, абавязковую ўмову далейшага руху наперад!

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б), на чале з т. Сталіным!

Перабудова партработы забясьпечыла перавыкананьне сустрэчнага

Аўтаматны цэх зьяўляецца асноўным на фабрыцы «Пролетарская перамога» (Барысаў). Ад работы гэтага цэху залежыць выкананьне вытворчай праграмы ўсімі цэхамі, залежыць якасьць прадукцыі.

Партыйная ячэйка другой зьмены гэтага цэху сапраўды па-баявому ўзялася за перабудову сваёй работы. У аснову перабудовы пакладзена задача поўнай рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна.

Ячэйка пядаўна правяла перастаноўку партыйных сіл на брыгадах і гэтым забясьпечыла партыйны ўплыў у кожным вытворчым і пізавым зьвяне. Кожны член партыі мае пэўную нагрузку, адказвае за пэўны вучастак работы на вытворчасьці.

Пры перавыбарах бюро ў цэху арганізаваны дзьве гаспадарча-разрахунковыя брыгады. Яны за першыя 11 дзён работы выканалі вытворчае заданьне на 128 проц. Паводле пляну аўтамат павінен выпускаць 290 касет, брыгады-ж па сустрэчным пляне выканалі 295. На справе-ж і гэту норму яны перавыконваюць, даючы штодзённа 316 касет.

Брыгады пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі разгарнулі работу па ліквідацыі абязьлічкі. Да кожнага аўтамату прымацаваны рабочыя, у рэзультаце прастоі аўтаматаў у рамонце зьнізіліся на 21 проц.

У брыгадах уведзена індывідуальная зьдзельшчына, устаноўлена прагрэсіўная аплата працы.

Разгортваньнем масавай работы ячэйка дабілася поўнага ахопу рабочых цэху сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам і паказвае сапраўдныя ўзоры работы.

Н. Нэйдлін.

Да XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі

чырвонасьцяжны завод „Бальшавік" падыходзіць з вялікімі вытворчымі перамогамі

Датэрміновае выкананьне прамфінпляну—лепшы ўзор падрыхтоўкі

Менскі чырвонасьцяжны завод «Бальшавік» выканаў прамфінплян трэцяга рашаючага году пяцігодкі на 27 дзён раней тэрміну па 112,13 проц. у колькасных адносінах і на 100,2 проц. у цэнавым азначэньні.

На аснове рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна, мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва завод дасягнуў вялікіх посьпехаў і ў галіне зьніжэньня сабекошту. Замест плянавых 4,23 проц. зьніжэн сабекошт за 10 месяцаў па 11,5 проц. Перавыкананьнем пляну па зьніжэньні сабекошту дана ў фонд сацыялістычнага будаўніцтва звыш пляну 310.409 руб.

Важнейшым фактарам зьніжэньня сабекошту зьявілася **перавыкананьне усіх якасных паказальнікаў** адхіленьня ад гатункавасьці і рацыяналізацыя вытворчасьці. Ад рэалізацыі рацыяналізатарскага пляну завод дабіўся 253.861 руб. эканоміі.

Такія бліжэйшыя паказальнікі вытворчай работы зьяўляюцца рэзультатам бальшавіцкага змаганьня партыйнага калектыву заводу за павышэньне працоўнай дысцыпліны, павялічэньне прадукцыйнасьці працы, паклаўшы ў аснову сваёй работы выкананьне шасьці сталінскіх умоў. Наколькі сьвядома адносяцца рабочыя масы да выкананьня сваіх абавязкаў на сацыялістычным прадпрыемстве, сьведчыць ужо той факт, што прагулы на заводзе зьведзены зараз да 0,08 проц.

Для забясьпячэньня посьпехаў барацьбы за прамфінплян кіраўніцтва партыйнага калектыву правільна расставіла партыйныя сілы на ўсіх участках вытворчасьці, сапраўды перанесла цэнтр цяжару партыйна-масавай работы ў пізавыя вытворчыя зьвеньні. На заводзе налічваецца 5 цэхавых вытворчых парт'ячэек, ячэйка ЗРК і 56 партыйных груп, якія арганізаваны за ўсіх вытворчых брыгадах.

Бюро парткалектыву зьлэрацыйна і канкрэтна кіруе работай пізавых партзьвеньняў. Штодзённа ў вызначаныя дні партыйна-масавай работы на заводзе праводзяцца нарады сакратароў цэхавых парт'ячэек, у якіх прапрацоўваюцца канкрэтныя задачы на бліжэйшы перыяд. На парадах группарторгаў, брыгадных трыбунтнікаў і сходах партгруп, якія перыядычна праводзяцца, абмяркоўваюцца пытаньні якасьці прадукцыі, рацыяналізацыі, працоўнай і партыйнай дысцыпліны, вучобы і г. д. Ва ўсёй гэтай работе кіраўніцтва парткалектыву рабіла ўпор на тое, каб кожны камуніст на прадпрыемстве сапраўды падаваў узорныя прыклады работы для ўсіх рабочых.

Усе мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні вытворчых задач праводзяцца мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. У гэтых адносінах ёсьць даволі паказальныя рэзультаты. На 1-га сьнежня сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена 93 проц. усіх рабочых, служачых і ІТР. 2 асноўныя цэхі заводу (1 і 2-гі хромавы), у якіх налічваецца 518 рабочых, ахоплены на 100 проц. сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Камуністы заводу ідуць на чале рабочых мас па выкананьні прамфінпляну. Парткалектыў дабіўся ажыцьцяўленьня дырэктывы 16-га зьезду партыі аб пагалоўным удзельнічаньні ў сацспаборніцтве і ўдарніцтве камуністаў і камсамольцаў. Усе партыйцы заводу працуюць сапраўднымі сацыялістычнымі мэтадамі. **93,9 проц. камуністаў перавыконваюць вытворчыя заданьні.**

Партыйны калектыў заводу пастойліва змагаецца за ліквідацыю абязьлічкі і ўраўнілаўкі ў рабоце. Зараз у асноўным усе рабочыя прымацаваны да машын, варштатаў і пэўных працэсаў вытворчасьці. Вылучаны брыгады сьлесараў для рамонту машын. Кожная брыгада праводзіць рамонт пэўнай колькасьці машын і варштатаў.

У мэтах ліквідацыі ўраўнілаўкі ў зарплаце пераглядзана старая тарыфная сетка. Пераведзена ўжо на прагрэсіўна-прэміяльную сыдэльшчыну 10 брыгад, 2 брыгады пераведзены з месячнага акладу на зьдзельную аплату. Дзякуючы праведзеным мерапрыемствам па ліквідацыі ўраўнілаўкі, амаль на ўсіх галінах вытворчасьці заводу значна павышана прадукцыйнасьць працы і побач з гэтым павялічылася заработная плата рабочых, галоўным чынам вядучых прафэсій.

Мабілізуючы масы на выкананьне прамфінпляну, партыйны калектыў заводу рашуча змагаўся з усякімі праяўленьнямі апартунізму ў тэорыі і на практыцы, па-бальшавіцку, непрымірыма рэагаваў на ўсякія спробы апартуністаў скасіць лінію партыі.

Няўхільным ажыцьцяўленьнем генэральнай лініі партыі, перабудовай работы ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай на аснове ажыцьцяўленьня шасьці сталінскіх умоў партыйны калектыў забясьпечыў датэрміновае выкананьне заводам прамфінпляну па колькасных і якасных паказальніках.

Датэрміновае выкананьне прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі зьяўляецца лепшым паказальнікам бальшавіцкай падрыхтоўкі партыйнага калектыву заводу «Бальшавік» да Менскай гарадзкой партканфэрэнцыі, 14-га зьезду КП(б)Б і 17-ай Усесаюзнай партканфэрэнцыі. Партыйны калектыў будзе і надалей з бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за пасьпяховае выкананьне вытворчай праграмы 4-га, заключнага году пяцігодкі.

Гелер, Шамэс, Мінкін.

АДКРЫЛАСЯ ПУХАВІЦКАЯ РАЙПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ

ПУХАВІЧЫ, 28-XII. (ПА ТЭЛЕГРАФУ АД НАШАГА СПЭЦКОРА). УЧОРА АДКРЫЛАСЯ ПУХАВІЦКАЯ РАЙПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ. З ДАКЛАДАМ ЦК КП(б)Б ВЫСТУПІЎ ТАВ. **АМБРАЖУНАС.**

КАНФЭРЭНЦЫЮ ВІТАЛА ДЭЛЕГАЦЫЯ ЧЫГУНАЧНІКАЎ. РАБОЧЫЯ ЧЫГУНАЧНІКІ ЗАПЭЎНІЛІ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЮ, ШТО БУДУЦЬ ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ ТРАНСПАРТУ, ЗА ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ АСЕНЬНЯ - ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК. **ВАЛЬФСОН.**

А. Джэлюк, В. Самуцні

Супроць трацкісцкага паклёпу на ленінскі камсамол і КП(б)Б

Трацкісты - кантрабандысты, фальсыфікуючы гісторыю нашай бальшавіцкай партыі, зьвязаючыся вужом, імкнуцца пралезьці ва ўсе шчыліны на ідэалёгічным фронце з тым, каб працягнуць сваю контр - рэвалюцыйную ідэалёгію.

Адным з яркіх узораў працягваньня кантрабандным шляхам трацкісцкіх ідэй зьяўляецца кніжка Олікера і Разэнблюма «Нарысы па гісторыі камсамолу Беларусі».

У названай кніжцы, па-першае, ігнаруецца роля бальшавіцкай партыі, як правадыра міжнароднага пралетарыяту, у тым ліку і правадыра між народнага рабочага юнацкага рэвалюцыйнага руху, які зьяўляецца неадлучнай частцай рэвалюцыйнага руху пралетарыяту.

Па-другое, працягваецца ў голай, нічым не прыкрытай форме ідэалізацыя Бунду, ППС і беларускіх контрэвалюцыйных нацыяналістычных арганізацый.

Па-трэцяе, адмаўляецца кіруючая роля партыі юнацкім рухам на Беларусі, па-трацкісцку процістаўляецца камсамол партыі, узводзіцца нічуваны паклёп на КП(б)Б, якая быццам-бы ігнаравала юнацкі рух, не падтрымлівала яго і не зьяўляецца арганізатарам камсамолу ў БССР.

Па-чацьвертае, ня толькі не даецца крытыкі контр - рэвалюцыйнаму трацкізму (кніжка выйшла ў 1927 годзе), а, наадварот, аўтары запісваюць трацкістаў у разрад арганізатараў і правадыроў Камінтэрну (Раковскі).

Аўтары ўмудраюцца запісаць таксама Розу Люксэмбург у разрад бальшавікоў - ленінцаў, якія да канца праводзілі бальшавіцкую лінію.

Фальсыфікуючы факты разьвіцьця камсамольскай арганізацыі, як рэзерву нашай бальшавіцкай партыі, аўтары пад рознымі відамі працягваюць установкі аб тым, што папярэднікамі ЛКСМБ, в яніх ён вырас, былі меншавіцкія і поўменшавіцкія нацыяналістычныя арганізацыі моладзі, пакшталт Югенд-Бунд, Югенд-Фэрэйн і г. д.

Па гэтых асноўных каналах ідзе скажэньне і фальсыфікацыя рабочага юнацкага руху ў БССР.

Прэтэндуючы на «тэарэтыкаў» гісторыі юнацкага руху, аўтары разам з тым узводзяць паклёп і на КП(б)Б, паказваючы арганізацыю КП(б)Б, як наносная выпадковае зьявішча, як партыю, якая не кіравала Кастрычніцкай рэвалюцыяй, не зьяўлялася авангардам рабочай клясы. Адмаўляючы кіруючую і арганізацыйную ролю КП(б)Б, аўтары сьцьвярджаюць, што наша партыя прышла да ўлады толькі ў выніку слабасьці меншавікоў, эсэраў і бундаўцаў, якія нібы не аказвалі супраціўленьня. Так, на старонцы 95 аўтары сьцьвярджаюць:

> **«Адным з ПЕРШЫХ КРОКАЎ ПАСЬЛЯ ПЕРАВАРОТУ Ў ЛЮТЫМ ПАВІННА БЫЛО БЫЦЬ СТВАРЭНЬНЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ (падкрэсьлена намі) для палітычнага кіраўніцтва краінай і фронтам».**

На старонцы 94 аўтары, адмаўляючы кіруючую ролю партыі саветамі, заяўляюць, што:

> **«Кіраўніцтва саветам належала бальшавікам, што было магчыма толькі дзякуючы поўнай неарганізаванасьці досыць моцных на фронце сацыял-рэвалюцыянэраў і Бунду, які меў шырокія сувязі з рабочымі масамі Менску».**

Ня цяжка зразумець, што гэта арыі з трацкісцкай «опэры». Яны старанна перапяваюцца гэтымі «гісторыкамі» для таго, каб даказаць, што бальшавікі ня мелі сувязі з масамі, не стаялі на чале рэвалюцыі.

Па тэй-жа пратантанай трацкісцкай сьцежцы ідзе процістаўленьне маладых рабочых дарослым адмаўляецца кіруючая роля партыі камсамолам, працягваецца авангардысцкая ўстаноўка.

І гэта невыпадкова. Уся кніжка ад пачатку да канца адмаўляе, ігнаруе кіруючую ролю партыі юнацкім рэвалюцыйным рухам.

Складаючы «гісторыю» на трацкісцкі манэўр, Олікер і Разэнблюм на 102 старонцы пахабна заяўляюць:

> **«Цэлы рад спроб рабочай моладзі да ўтварэньня сваіх арганізацый былі няўдачнымі, бо ня мелі падтрыманьня з боку партыі».**

Аднак, будучы ігнараваным нашай партыяй, юнацкі рух, паводле аўтараў, настолькі разрося самастойна, што сам (?) прымусіў партыю зьвярнуць на сябе ўвагу.

> **«І толькі пасьля, калі палітычная актыўнасьць і выстарчальная гатоўнасьць рабочай моладзі былі даведзены, партыя пачынае даваць ёй НЕКАТОРАЕ (падкрэсьлена намі, Д. С.) падтрыманьне, што дапамагло ўтварэньню саюзу моладзі».**

Тут аўтары нераходзяць усякія межы клусьні і фальсыфікацыі. Паўтараючы сьледам за Троцкім авангардысцкую тэорыю процістаўленьня маладых дарослым, камсамолу партыі, аўтары імкнуцца даказаць, што бальшавіцкая партыя ня толькі не арганізоўвала ЛКСМБ, а нават неахвотна падтрымлівала юнацкі рух.

Хто-ж усё такі арганізаваў камсамол на Беларусі?

Наконт гэтага аўтары «Гісторыі» гаворачы пра Полацкую арганізацыю пішуць:

> **«Пасьля адыходу немцаў распачаліся размовы аб стварэньні рэвалюцыйнай арганізацыі. У гэтым прышоў на дапамогу аддзел народнае асьветы».**

Як бачыце, камсамол, паводле гэтых «гісторыкаў», арганізаваны не бальшавіцкай партыяй, а аддзелам народнае асьветы.

Для чаго патрэбна было такое сьцьвярджэньне?

Аўтары добра ведаюць, што гэта ня так, што гэта хлусьня. Але такая ўжо роля трацкісцкіх кантрабандыстаў. Пусьціць пыл у вочы і прыкрыць абшарпанымі лахманамі махінацыі фальсыфікатараў — вось мэта.

Прысваеньне аддзелу Нарасьветы ролі арганізатара камсамолу — гэта толькі манэўр.

На самой справе аўтары даводзяць іншае. Яны прыкладаюць усе патугі, каб даказаць, што асноваположнікамі камсамолу на Беларусі зьяўляюцца меншавіцкія і поўменшавіцкія нацыяналістычныя арганізацыі Югенд-Бунд, Югенд-Фэрэйн і інш.

Аўтары са старонак гісторыі заяўляюць, што ў Віцебску камсамол вырас з Югенд-Фэрэйну, у Мазыры — з Югенд-Бунду, а ў Бабруйску

> **«28-га лістапада 1918 году, калі ста. па вядома аб уступленьні Чырвоных войск... Югенд-Бунд ужо фактычна быў камсамолам» (стар. 116).**

З гэтай мэтай Олікер і Разэнблюм ідэалізуюць Югенд-Фэрэйн, Югенд-Бунд і яго апякуна Бунд.

Гэтыя юнацкія арганізацыі ў асьвятленьні Олікера і Разэнблюма атрымліваюцца наскрозь рэвалюцыйнымі і бальшавіцкімі арганізацыямі.

Няма ніякай патрэбы даказваць, што як Югенд-Фэрэйн, так і Югенд-Бунд ні ў якай меры не маглі і не зьяўляліся па зьместе сваёй работы і па сваіх мэтах і задачах папярэднікамі камсамолу.

Даволі напомніць, што Югенд-Бунд арганізован Бундам і працаваў пад яго кіраўніцтвам. Як далёка Бунд заўсёды быў ад бальшавізму — кожнаму вядома. І тым больш ясна, што яго вырадак Югенд-Бунд ніколі нічога агульнага ня меў і ня мог мець з камсамолам, арганізаваным і кіраваным партыяй Леніна.

Паказваючы гісторыю імённа ў такім выглядзе, трацкісцкія элемэнты спачатку юнацкія арганізацыі робяць «перадавым атрадам сацыяльнай рэвалюцыі» (стар. 136), прышсваюць ім авангардысцкую ролю ў Кастрычніку на Беларусі, даводзяць, што «з боку палітычных партый (стар. 127) моладзь не знайшла канечнага падтрыманьня», а пасьля ставяць знак роўнасьці паміж камсамолам і Югенд-Бундам.

Калі да гэтага дадаць сьцьвярджэньне, што «бальшавіцкая партыя мела ў Беларусі абмежаваную базу», што яе ячэйкі «ня мелі вялікай сувязі з мясцовай рабочай масай» (стар. 126), дык стане ясным, якую мэту маюць гэтыя, трэба прызнаць яшчэ не дагэтыя фальсыфікатары.

Падобных да вышэй прыведзеных сьцьвярджэньняў у кніжцы шмат. Але абмежуемся па гэтым.

* * *

Паклёпніцкія выпады супроць камсамолу самым цесным чынам зьвязаны і выцякаюць з тэй непартыйнай, ня-ленінскай характарыстыкі рэвалюцыйнага руху, якую разьвіваюць гэтыя «майстры» «нарысаў гісторыі».

Даволі паказаць на той факт, што Олікер і Разэнблюм лічаць сацыял-дэмакратычную партыю Польшчы «вельмі вытрыманай, марксыцкай арганізацыяй» па тэй прычыне, што на чале не «стаялі такія выдатныя рэвалюцыянэры - марксысты, як Роза Люксэмбург...»

Сьледам за ідэалізацыяй люксэмбургізнства ідэалізуецца контр - рэвалюцыйны БУНД, які, нібыта быў арганізован «кіраўніком яўрэйскага рабочага (падкрэсьлена намі — Д. С.) руху». І таму партыя Бунду, паводле аўтараў, «была кіраўніцай яўрэйскага пралетарыяту ў барацьбе за эканамічнае, грамадзкае і палітычнае вызваленьне».

У канцы гэтага разьдзелу даказваецца, што рабочая кляса і сялянства давалі адпор розным партыям не на іх «клясавай рэвалюцыйнасьці, а па тым, як яна (партыя—Д. С.) абараняе нацыянальныя інтарэсы». Тут аўтары процістаўляюць нацыянальнае пытаньне агульным клясавым інтарэсам пралетарыяту, не разумеючы іх сувязі.

* * *

Ленін ня раз падкрэсьліваў той вялікай важнасьці факт, што меншавікі, эсэры і да іх падобныя арганізацыі для таго, каб уплываць на рабочыя масы, павінны апранацца ў сацыялістычную вопратку, прыкрывацца «левымі» фразамі. Гэта ўлюбёны манэўр усіх сацыял-і нацыяналфашысцкіх партый. На прыкладзе дзейнасьці меншавікоў, эсэраў, ППС, й г. д. рабочая кляса цалкам упэўнілася ў контр - рэвалюцыйнай сутнасьці гэтых арганізацый.

Як-жа пасьля гэтага можна, ня здраджваючы рабочай клясе, не паўтараючы сьледам за Троцкім, рыхаючы з бальшавізмам, заяўляць, што меншавіцкія і нацыянал - сацыялістычныя партыі адыгрывалі ў часе рэвалюцыі 1917 г. рэвалюцыйную ролю?

Ясна, што погляды й лініі, выкладзеныя гэтымі «гісторыкамі», ня толькі ня маюць **нічога агульнага з бальшавізмам** і ленінізмам, але знаходзяцца ў простай процілегласьці з ім.

Кніжка прадстаўляе з сябе кантрабандным пратантам паклёпаў на партыю, на бальшавізм, на ленінскі камсамол.

* * *

ЛКСМБ, які арганізован і працуе пад выпрабаваным кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, на ўсім гістарычным працягу свайго існаваньня быў і будзе верным правадніком генэральнай лініі партыі. Усякія спробы ахаяць камсамол, аслабіць яго згуртаванасьць вакол ленінскай партыі сустрэнуць зараз, як і заўсёды, сакрушальны адпор.

Камсамол Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюзу, мае свае баявыя традыцыі, сваю бальшавіцкую загартаванасьць і слаўную гераічную гісторыю. Яго дзейнасьць і барацьба самым цесным чынам зьвязаны з арганізатарскай, кіруючай роляй КП(б)Б у стварэньні Кастрычніка на Беларусі. Гэту гісторыю неабходна пазнаёміць на аснове бальшавіцкай мэтадалёгіі. ЦК ЛКСМБ бяспрэчна ў найкарацейшы тэрмін правядзе такую работу.

Трэба неадкладна выкінуць трацкісцкі хлам, які і да сёньняшняга дня засьмечвае мазгі камсамольцаў некаторых ячэек.

Патрэбна рашуча адкінуць усё, што фальсыфікуе, скажае бальшавіцкі шлях узьнікненьня і разьвіцьця вернага памочніка нашай партыі — Ленінскага Камсамолу.

XIV ЗЬЕЗД КП(б)Б І XVII УСЕСАЮЗНУЮ партканфэрэнцыю сустрэць ліквідацыяй запазычанасьці ПА НЕРЭАЛІЗАВАНЫХ РАБОЧЫХ ПРАПАНОВАХ

Мабілізаваць унутраныя рэсурсы

Сацыялістычная рацыяналізацыя зьяўляецца важнейшым вагаром мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, зьнижэньня сабекошту, паляпшэньня якасьці прадукцыі і росту прадукцыйнасьці працы.

Тав. Куйбышаў у сваім дакладзе на 16 партзьезьдзе аб пяцігадовым пляне прамысловасьці з усёй сілай падкрэсьліў, што кожны процант паляпшэньня работы, на аснове рацыяналізацыі, памножаны на нашу вялікую прамысловасьць, якая пашыраецца з кожным днём, дае краіне вялізарную колькасьць дадатковай прадукцыі.

Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што значэньне сацыялістычнай рацыяналізацыі ўсьвядомлена яшчэ далёка ня ўсімі кіраўнікамі і прафэсыянальнымі арганізацыямі. Карэспандэнцыі аб становішчы рацыяналізацыі на Гомельскім заводзе «Пралетары», на добрускай фабрыцы «Герой працы» зусім выразна гавораць аб тым, што пасьлядоўнае мабілізацыі рэсурсаў, ажыцьцяўленьня рабочых вынаходстваў і рацыяналізатарскіх прапаноў не адводзіцца належная ўвага. Дзесяткі прапаноў часта вельмі каштоўных, якія даюць значны эканамічны эфэкт і ўзьнімаюць прадукцыйнасьць працы, месяцамі марнуюцца ў рацыяналізатарскіх бюро, у партфэлях адміністрацыі.

Трэба дабіцца неадкладнага пералому ў галіне правядзеньня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў у прамысловасьці.

«Сацыялістычная рацыяналізацыя, якая зьяўляецца лепшым спосабам мабілізацыі захаваных магутных рэзэрваў, павінна стаць неадлучнай часткай практычнай работы ўсяго адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу прамысловасьці і быць у цэнтры тэхнічна-вытворчай работы прадпрыемстваў». Гэта дырэктыва 16-га зьезду УсеКП(б) павінна быць ажыцьцёўлена ўсімі партыйнымі, прафэсыянальнымі і гаспадарчымі арганізацыямі.

Сустрэць XIV зьезд КП(б)Б і XVII усесаюзную партканфэрэнцыю максымальнай мабілізацыяй унутраных рэсурсаў, самым шырокім скарыстаньнем рабочых рацыяналізатарскіх прапаноў — задача ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Ні аднэй неразгледжанай рацыяналізатарскай прапановы! Ні аднэй нерэалізаванай і нескарыстанай рабочай вынаходкі!

Дзесятні „замарожаных" рабочых прапаноў

ГОМЕЛЬ. Плян 1931 году на заводзе «Пралетары» прадугледжвае атрымаць эканомію ад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў каля 150.000 рублёў.

За першае паўгодзьдзе г. г. рэалізавана 54 прапановы, якія даюць 47.650 руб. эканоміі, што складае 33,1 проц. пляну. У 3-м квартале ажыцьцёўлены 58 мерапрыемстваў, якія даюць эканоміі 32.150 р.—20,6 проц гадавога заданьня. Такія-ж прыблізна лічбы дае 4-ы квартал.

Як мы бачым, рацыяналізатарскі плян заводу «Пралетары» праводзіцца ў жыцьцё яўна нездавальняюча. Тут даюць аб сабе ведаць чыноўніцка-бюракратычныя адносіны пасобных адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў да рабочых-вынаходцаў. Рад прыкладаў пацьвярджаюць гэта.

Плёнка для фрэзэроўкі валікаў была адхіта і марнавалася ў такарна-сьлясарным цэху, пакуль фрэзэроўка зусім ня спынілася. Зроблены 2 фармовачныя машыны, але яны не скарыстоўваюцца, бо няма апакаў да іх. Вось ўжо 8 месяцаў, як вырабляецца эксэнтрычны вэл, і ніяк яго ня скончаць.

Яшчэ 1-га лютага паступіла прапанова ад майстра кацельнага цэху Кофмана аб вырабе варыятару для загібу бакоў да вальцоўкі. Варштат дагэтуль ня пушчан. З 1-га лютага марнуецца прапанова аб выпуску страгальных варштатаў, што дало-б эканоміі ў 3.500 рублёў. Белмэталяабяднаньне не адпускае патрэбных сродкаў — 2.000 рублёў.

Замарожаны рацыяналізатарскія прапановы аб магнітным сэпаратары для вылаўліваньня прымесі ў медзяных стружках, аб рэзэрвуары з прыводнай помпай і г. д.

Дрэнна стаіць справа з мэханізацыяй пад'ёмных работ. Рабочыя ўнесьлі рад каштоўных прапаноў, якія дагэтуль не праводзяцца ў жыцьцё. Яркі прыклад. Яшчэ ў 1929 годзе паступіла прапанова зрабіць кран у кацельным цэху, што дало-б эканамічны эфэкт у разьмерах 4.000 руб. Але кран дагэтуль не пастаўлен. Ня зроблен і пад'ёмнік для падачы ліцця ў арматурным цэху. Дзесяткі тон ліцьця прыходзіцца насіць на насілках па другі паверх; 2.700 рублёў марна гінуць.

Такім чынам, на заводзе «Пралетары» замарожаны дзесяткі каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў. Такое становішча ні ў якім разе нецярпіма. Трэба зруйнаваць перашкоды на шляху рабочай здагадкі.

«ЧЫРВОНАЯ ВАГРАНКА»

Правесьці пашпартызацыю заводзкага абсталяваньня

Дагэтуль ні ні адным прадпрыемстве БССР не наладжана правільная інвэнтарызацыя машын, якая зьяўляецца асновай выраўнай работы на вытворчасьці.

Ні на заводах, ні ў аб'яднаньнях, ні ў ВСНГБ вы ня знойдзеце дакладных даных аб колькасьці і характары сродкаў вытворчасьці, якія ёсьць у тым ці іншым цэху, аб заводзе, аб часе паступленьня абсталяваньня ў эксплёатацыю, аб ступені амартызацыі і г. д. (за выключэньнем некаторых прадпрыемстваў металаабяднаньня).

Ня менш чым у аб'яднаньнях ВСНГБ стаіць справа ў аб'яднаньнях Наркамснабу і на камунальных прадпрыемствах.

Вось чаму пастанова ўраду СССР аб нападжаньні ўсёрнага ўліку і аб правядзеньні ўсесаюзнага перапісу абсталяваньня мае вялізарнае значэньне для БССР.

Галоўная прычына адсутнасьці правільнага ўліку ў тым, што пры паступленьні савецкага і імпартнага абсталяваньня ніколі не складаліся тэхнічны вопіс для інвэнтарызацыі, а рабіліся трафарэтныя, фарматныя акты, якія не давалі ніякага ўяўленьня аб разьмерах, марцы, прадукцыйнасьці абсталяваньня.

Гэты прабел павінна запоўніць надыходзячая пашпартызацыя абсталяваньня.

А. РАТНЭР.

Закінуты вучастак

Плян ажыцьцяўленьня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і рабочых вынаходзтваў на добрускай папяровай фабрыцы — «Герой працы», з-за безадказных, бюракратычных адносін адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу і прафорганаў да гэтай важнейшай справы ня выкананы.

Страты валакна дасягалі ў асобныя месяцы да 15-20 проц. Рабочыя ўносьлі рад рацыяналізатарскіх прапаноў, якія забясьпечвалі амаль поўнае ўлаўленьне гэтага валакна. Ажыцьцяўленьне рацыяналізатарскіх мер дало-б магчымасьць з'эканоміць некалькі дзесяткаў тысяч рублёў золатам. Аднак, прапановы ня выкананы.

Каля фабрыкі вырасьлі горы крэйдавых адкідаў. Гэтую крэйду можна было скарыстаць, замест дарагога прывознага кааліну. Між тым, гаспадарнікі кансэрватыўна адносяцца да гэтай справы. Фабрыка «Герой працы» мае рад непатрэбных матар'ялаў і абсталяваньня на суму каля 300.000 рублёў. Ня прымаюцца меры да рэалізацыі гэтых лішкаў. Адміністрацыя не праяўляе ініцыятывы па адшуканьні спажыўцоў, якім можна было-б прадаць непатрэбныя матар'ялы.

Ужо некалькі год валяюцца дзесяткі тон чыгуну ў выглядзе калёнак. Гэтыя калёнкі не патрэбны і ніколі ня будуць скарыстаны фабрыкай, але аддзел забесьпячэньня чамусьці не здае іх «Мэталялому». Між тым, напрыклад, Гомсельмаш адчувае вострую патрэбу ў чыгуне.

Пад адкрытым небам валяюцца і іржавеюць некалькі машын, сярод іх пашкавая машына, якая пасьля належнага рамонту магла-б добра працаваць. Яшчэ 5 год назад, «Рэммаштрэст» дабіўся дазволу забраць гэтую машыну, але яна і дагэтуль ляжыць на тэрыторыі прадпрыемства і псуецца з-за адсутнасьці гаспадарчага вока.

Прыведзеныя факты гавораць аб тым, што кіраўніцтва фабрыкі аддае мала ўвагі мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, забывае аб вялікім значэньні гэтага пытаньня.

На рацыяналізатарскую работу па фабрыцы «Герой працы» трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу, бо яна зьяўляецца адным з важнейшых вагароў ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку.

Ударнікі «Зьвязды»:
КЛІМЁНАК, ПОЛЯК, ГОТГЕЛЬД і РАХЛІН.

Аб буржуазна-рвацкіх тэндэнцыях у саўгасах Наркамзему і Белкаапсаюзу

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б абгаварыў пытаньне аб буржуазна-рвацкіх тэндэнцыях, выяўленых пры праверцы ходу зьмены збожжа, праведзенай у 130 саўгасах. Прэзыдыум ЦКК канстатаваў, што «дырэктары значнай часткі саўгасаў замест мабілізацыі ўсіх збожжа-фуражных рэсурсаў для здачы дзяржаве максымальнай колькасьці таварнага хлеба сталі на шлях утойваньня ад дзяржавы сваіх таварных лішкаў, тым самым праяўляючы буржуазна-опазыцыйныя тэндэнцыі ў выдатканьні збожжа і кулацкае супраціўленьне збожжазагатоўкам».

Прэзыдыум ЦКК устанавіў, што ў саўгасах Белсельаб'яднаньня не вялося «ніякай барацьбы за максымальны ўраджай, засеяных у прыгарадных гаспадарках для мэтаў рабочага снабжэньня 4.893 гэкт. гародніны і 3.460 гэкт. бульбы і, што ў вызначэньні пляну здачы прадукцыі, дырэкцыя Белсельгасаб'яднаньня выходзіла з яўна праваапартуністычных і рвацкіх установак».

У пастановах Прэзыдыуму ЦКК адзначаецца таксама, што буржуазныя тэндэнцыі ў саўгасах Наркамзему знайшлі свой адбітак у цэнтральным апараце саўгастрэстаў і Наркамзему.

Прэзыдыум ЦКК лічыць устаноўленым, што галоўнымі вінаватымі гэтых скажэньняў у рабоце цэнтральных арганізацый зьяўляецца т. т. **Грабенчык і Самохін** (Белсаўгастрэст), **Аўчыньнікаў і Стрыго** (Сьвінавод), **Каралёў** (Насеннтрэст), **Паніматка** (Наркамзем), **Сінёў** (Саюзхлеб).

Прэзыдыум ЦКК пастанавіў зьняць з працы члена прэзыдыуму Белкаапсаюзу тав. **Вайцаховіча** за яўна праваапартуністычную дзейнасьць, абвясьціць яму суровую вымову і накіраваць на 2 гады на нізавую савецкую гаспадарчую работу. Улічваючы, што галоўны вінаваты буржуазна-рвацкіх тэндэнцый у саўгасах НКЗему тав. Грабенчык з працы ўжо зьнят і прыцягнут да партыйнай адказнасьці, прэзыдыум ЦКК абмежаваўся ў адносінах астатніх т.т. катэгарычным папярэджаньнем, што ў выпадку паўтарэньня фактаў простага ці ўкоснага патураньня імі кулацка-рвацкай практыкі, яны будуць прыцягнуты да самай суровай партыйнай адказнасьці.

Рад дырэктароў саўгасаў прыцягнут да суровай адказнасьці—дырэктар саўгасу «Дашкавічы» **Жураўлёў** выключан з партыі, дырэктар саўгасу «Бярэзіна» зьнят з работы з забаронай на працягу 2 год займаць адказныя пасады, тэхнічны дырэктар саўгасу «Тур» адданы пад суд і г. д.

Прэзыдыум ЦКК прызнаў плян збожжазагатовак саўгасаў рэальным і абавязковым для выкананьня і прапанаваў у бліжэйшыя-ж дні закончыць поўнасьцю здачу збожжа. У пастановах прэзыдыуму ЦКК вызначан рад канкрэтных мерапрыемстваў па перабудове сыстэмы кіраўніцтва саўгасамі. Гарадзкім і раённым камітэтам партыі даручана арганізаваць абгаварэньне гэтых пастаноў на адкрытых партыйных сходах усіх саўгасаў БССР.

Швэйная прамысловасьць БССР да заключнага году пяцігодкі

Швэйная прамысловасьць БССР прыходзіць да чацьвертага, заключнага году пяцігодкі з вялікімі перамогамі. Дзякуючы правільнаму і выразнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі і вялікаму ўздыму творчага энтузіязму мас, швэйнікі выканалі пяцігадовы плян за тры гады.

Паводле пяцігадовага пляну мерка валася ў 1932-33 годзе выпусьціць прадукцыі па 149 млн. руб. Да 1 кастрычніка 1931 г. дана прадукцыі на 151 млн. руб., за ўвесь 1931 год выпушчана швэйных фабрыкатаў па суму каля 175 млн. руб.

Рабочыя швэйнай прамысловасьці дасягнулі значных посьпехаў і ў зьнижэньні сабекошту прадукцыі. Сабекошт зьнижан за тры гады на 21,1 проц., у трэцім квартале—на 22,4 проц., заданьне прадугледжвала зьнижэньне сабекошту за 5 год на 22,5%.

У галіне росту прадукцыйнасьці працы дасягнут прырост у 146,7 проц. пры заданьні на пяцігодку ў 88 проц.

Вядучыя прадпрыемствы швэйнай прамысловасьці значна перавыканалі свае праграмы. Фабрыка «Кастрычнік» па колькасьці прадукцыі ўжо да кастрычніка гэтага году выканала праграму 1932-33 году на 121 проц. Індустрыялізацыя краіны забясьпечыла буйныя перамогі ў рэканструкцыі тэхнічнай базы швэйнай прамысловасьці.

Адыйшлі ў галіну гісторыі саматужныя кравецкія майстэрні з іх пязьменнымі спадарожнікамі — вугальным прасам, іглой і пажной машынай. Іх замянілі матарныя машыны, аўтаматы, параэлекрычныя прэсы. На месцы саматужных майстэрань узьніклі набудаваныя, паводле апошняга слова тэхнікі, вялікія мэханізаваныя фабрыкі—«Сьцяг індустрыялізацыі», імя Дзяржынскага, «Кастрычнік», імя Баладарскага.

Зусім ліквідавана ў 1926 годзе ў швэйнай прамысловасьці БССР было занята 500 рабочых; у 1931 годзе працуе каля 20.000 чал.

Гэтыя дасягненьні—вялікія перамогі генэральнай лініі партыі; яны наносяць руйнуючыя ўдары па праваапартуністычнай тэорыі аб непасільнасьці тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі, гэтыя дасягненьні зьяўляюцца **важнейшым фактарам паляпшэньня матар'яльнага становішча працоўных і ажыцьцяўленьня дырэктывы партыі аб узмоцненым развіцьці лёгкай прамысловасьці,** якая вырабляе прадукцыю шырокага спажываньня.

Чацьверты, заключны год пяцігодкі швэйная прамысловасьць БССР сустракае пад знакам узмоцненага змаганьня за выкананьне якасных паказальнікаў.

1931 год павінен увайсьці ў гісторыю швэйнай індустрыі Беларусі, як год канчатковай перамогі на вучастку паляпшэньня якасьці нашай работы.

Над гэтай задачай павінны ўпарта і настойліва працаваць усе нашы партыйныя, прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі. Ключ да яе вырашэньня—у няўхільным ажыцьцяўленьні 6 умоў тав. Сталіна.

Плян 1932 году прадугледжвае павялічэньне прадукцыі швэйнай прамысловасьці да 250 млн. руб. Такое парастаньне тэмпаў магчыма толькі ў Савецкім Саюзе на ўмовах дыктатуры пралетарыяту, сацыялістычнай планавай гаспадаркі і вялікага разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы.

У будучым годзе мы павінны канчаткова дабіць тыя непаладкі, якія яшчэ маюць месца на пасобных прадпрыемствах.

Некаторыя-ж фабрыкі адсталі ў ажыцьцяўленьні заданьня 1931 году. Віцебская фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі», напрыклад, выканала толькі 83,7 проц. свайго прамфінпляну, Украінская сыстэма, якая парадзжала ўраўнілаўку, ліквідавана, але ўраўнілаўка яшчэ канчаткова ня зьнішчана. На фабрыках «Кастрычнік», «Камінтэрн» ёсьць яшчэ выпадкі, калі рабочыя ніжэйшага разраду атрымліваюць больш высокую зарплату, чым высокакваліфікаваныя швэйнікі, бо ня зьменены карэнным чынам, нормы выпрацоўкі і расцэнкі, індывідуальная прагрэсыўка яшчэ не ўкаранена. На фабрыках «Сьцяг індустрыялізацыі», імя 8 сакавіка ёсьць выпадкі абязьлічкі, якія перашкаджаюць поўнаму ажыцьцяўленьню ўсіх паказальнікаў і разгортваньню бальшавіцкіх тэмпаў работы.

Гаспадарчы разрахунак яшчэ не ажыцьцяўляецца як належыць на нашых прадпрыемствах, яшчэ ня стаў сустаўной часткай вытворчай работы. Аб гэтым сьведчыць той факт, што ф-ка «Кастрычнік», напрыклад, у кастрычніку навысіла агульны-заводзкія расходы па 10 проц.; сабекошт прадукцыі гэтай фабрыкі за 9 месяцаў зьнижан толькі на 3,2 проц.

Мы дабіліся пэўных посьпехаў у галіне паляпшэньня бытавых умоў рабочых. На ўсіх фабрыках працуюць ясьлі, сталоўкі, ЗРК, пабудаваны сьвятарнікі; адкрыты двое новых ясьлі, будуюцца новыя памяшканьні для сталовак, здан у эксплёатацыю новы жылы дом на 40 кватэр у Гомелі, будуюцца інтэрнаты ў іншых гарадох.

Аднак, мы ня можам задаволіцца гэтымі посьпехамі. Нельга сказаць, што зроблена ўсё патрэбнае для паляпшэньня бытавых умоў.

Той факт, што колькасьць рабочых у 1932 годзе павінна павялічыцца да 25.000 чалавек, прад'яўляе дасаблівы запатрабаваньні да работы па паляпшэньні быту рабочых-швэйнікаў.

Плян 1932 году прадугледжвае рад мерапрыемстваў па паляпшэньні якасьці швэйнай прадукцыі. Значна пашыраецца асартымэнт тавараў у мэтах поўнага задаваленьня патрэб рабочых і калгасьнікаў. Карэнным чынам зьмяняецца тэхналёгія выпрацоўкі фабрыкатаў, дадаецца рад новых апэрацый, якія былі раней ліквідаваны, але без якіх нельга атрымаць высокаякаснай прадукцыі. Шляхам пераходу на 6-дневку на прадпрыемствах, якія працуюць на дзьве зьмены, ліквідуецца абязьлічка. У мэтах поўнай ліквідацыі ўраўнілаўкі і забясьпячэньня большага прыработку кваліфікаваных швэйнікам пераразьмяркоўваецца прэміраваньне прыработку.

Поўнае выкананьне якасных паказальнікаў, зьнижэньне сабекошту і мемш, чым на 5 проц. у параўнаньні з гэтым годам, далейшы рост прадукцыйнасьці працы, строгае захаваньне гаспадарчага разрахунку, узмацненьне ўсіх крыніц накапленьняў, вышуканьне новых рэсурсаў, правільнае вядзеньне фінансавання гаспадаркі прадпрыемстваў— вось задачы, якія павінны забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне праграмы чацьвертага, заключнага году.

Зьлёт ударнікаў-швэйнікаў, які адкрываецца ў Віцебску, павінен па аснове сустрэчных плянаў мабілізаваць масы швэйнікаў, узьняць новую магутную хвалю сацэсаборніцтва і ўдарніцтва вакол барацьбы за ажыцьцяўленьне баявых і адказных задач чацьвертага, заключнага году пяцігодкі, узьняць на сябе новыя абавязацельствы перад падыходзячым XIV зьездам КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыяй.

Г. Тэклін.

Апошнія навіны з фронту індустрыялізацыі

Перамога на магнітабудзе

МАГНІТАГОРСК. Дзень 26 сьнежня на Магнітабудзе адзначан дзьвюма вялізарнымі перамогамі. Раніцой былі загружаны коксавыя печы коксахімкамбінату: увечары выпрабавана другая турбіна Магнітагорскай ДРЭС. Ударнікі станцыі правялі мантаж турбіны за 3 месяцы; у Англіі мантаж турбіны такой магутнасьці і такой сыстэмы цягнецца ад 6 да 8 месяцаў.

Пуск другой турбіны ў тры разы павялічвае магутнасьць электрастанцыі і давядзіць яе да 36.000 квт., што поўнасьцю забясьпечвае патрэбу першай чаргі Магнітабуду.

Скончан важнейшы цэх алюміньбуду

На 1 студзеня прызначаецца пробны пуск цэху электралізу — аднаго з важнейшых цэхаў алюміневага камбінату. Абсталяваньне цэху заканчваецца.

Уступае ў эксплёатацыю завод „Станкострой"

МАСКВА. У асноўным скончаны будаўніцтва і мантаж заводу «Станкострой» у Маскве. Завод прыступае да асваеньня новага імпартнага абсталяваньня.

На рашаючых вучасках

ВУГАЛЬ. За 25 сьнежня па ўсім СССР здабыта 191.284 тоны вугалю. За 26 сьнежня па Данбасе здабыта 129.065 тон (зьнижэньне здабычы тлумачыцца плянавым рамонтам капалень).

ТРАКТАРЫ. Сталінградзкі трактарны завод выпусьціў 23-25 сьнежня 117, 118 і 119 трактараў. Харкаўскі завод даў 26 сьнежня 45 трактараў і 51 матор. «Красный путиловец» выпусьціў 83 трактары і 61 матор.

Маскоўскі аўтазавод імя Сталіна (АМО) за апошнія тры дні даваў штодзенна па 25 машын.

МЭТАЛЬ. За 25 сьнежня па ўсім Саюзе зьпляўлена 13.825 тон чыгуну і 12.055 тон сталі (без малой металюргіі).

Работа папяровых фабрык БССР

За 20 дзён сьнежня папяровая фабрыка «Спартак» у Шклове выпусьціла 424 тоны паперы для друку. Кардонная фабрыка ў Суражы за 25 дзён сьнежня дала 151 тону картону пры пляне ў 150 тон.

Фабрыка імя Сталіна ў Рагачове выпрабіла 339 тон паперы для пісаньня — 96,9 проц. пляну.

На копыськім кафэльным заводзе

За дзьве дэкады сьнежня копыські кафэльны завод выпусьціў 153.000 кафэльных плітак.

І. ВЕРБА

Мацней агонь па буржуазна-рвацкіх тэндэнцыях

(Паводле матар'ялаў ЦКК НК РСІ)

Ленін ня раз падкрэсьліваў неабходнасьць «абараняць інтарэсы рабочай класы ад тых жменек, груп, пластоў рабочых, якія ўпарта прытрымліваюцца традыцый (навыкаў) капіталізму і працягваюць глядзець на савецкую дзяржаву па-ранейшаму: даць «ёй» работы менш і горш — сядраць з «яе» грошай больш».

Было-б вялікай памылкай думаць, што цяпер, у перыяд сацыялізму, шырокага разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы, барацьба з рвацкімі, антыцэнтраўнымі тэндэнцыямі зьяўляецца апошнім агонь. Рвацтва, буржуазна-мешчыцкія тэндэнцыі яшчэ існуюць, бо іх сацыяльныя карэні яшчэ ня зьнішчаны, — ня зьнішчан канчаткова класавы вораг, які ў сваім шалёным супраціўленьні сацыялістычнаму наступленьню па ўсім фронце, розным мэтадамі, у тым ліку і расчальваньнем рвацкіх спажывецкіх тэндэнцый, імкнецца сарваць выкананьне кароўна-гаспадарчых пляноў. Іменна тое, што рвацтва выходзіць за межы практыкі індывідуальнага ўрыванньня ад дзяржавы пасобным спэціялістам-рабочымі і перарастае ў пропіпастаўленьне апартуністычных элемэнтаў інтарэсаў «свайго» прадпрыемства інтарэсам пралетарскай дзяржавы — найлепш паказвае, што сацыяльныя карэні рвацтва месьцяцца ў супраціўленьні клясавага ворага сацыялістычнаму будаўніцтву, у кулацка-нэпманскім уплыве на адсталыя групы рабочых, калгасьнікаў і нават на пасобныя «клетачкі» пралетарскага змагарству—камуністычнай партыі. Гэтыя тэндэнцыі знайшлі свае найбольш яркае праяўленьне ў супраціўленьні збожжазагатоўчым пляна-м, якое праяўлена ў радзе калгасаў і саўгасаў.

Саўгасы БССР у цэлым, і асабліва перадавыя з іх ужо ня раз паказвалі прыклады ўзорнай работы, яны служылі і служаць магутным фактарам сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам нашай партыі саўгасы ператвараюцца ў высокатаварныя сацыялістычныя фабрыкі сельска-гаспадарчай прадукцыі.

Саўгасы зьяўляюцца пасьлядоўнасацыялістычным тыпам гаспадаркі і іх прадукцыя ёсьць уласнасьць пралетарскай дзяржавы. Таму іменна праяўленьне буржуазна-рвацкіх тэндэнцый з боку кіраўніцтва раду саўгасаў зьяўляецца асабліва нецярпімым.

Наяўнасьць буржуазных тэндэнцый у радзе беларускіх саўгасаў была ўжо выкрыта партыяй. Пастановай ЦК КП(б)Б ад 25-га кастрычніка была рэзка асуджана праваапартуністычная дзейнасьць кіраўніцтва Белсаўгастрэсту, якое нашталт «кіраўнікоў» Саюзцукру, Збожжасаўгастрэсту, аказала супраціўленьне выкананьню збожжазагатоўчых пляноў.

Праведзенае ЦКК РСІ праверка збожжа-фуражных балянсаў у 130 саўгасах значна дапоўніла малюнак ашуканьваньня партыі і выявіла з усёй паўнатой праваапартуністычную сутнасьць былога кіраўніцтва Саўгастрэсту і канкрэтных выканаўцаў іх волі дырэктароў раду саўгасаў.

У значнай колькасьці праверэных саўгасаў у тэй ці іншай меры былі выяўлены факты буржуазна-рвацкіх тэндэнцый і ашуканьваньня партыі.

Найбольш характэрнымі формамі праяўленьня гэтых тэндэнцый зьяўлялася перавышэньне ў балянсах устаноўленых норм спажываньня хлеба і фуражу, паказаньні ў балянсах фіктыўнай значна перавышанай колькасьці рабочых, жывёлы, фіктыўных і яўна перапаменшаных даных аб ураджайнасьці, утойваньне збожжавых запасаў і г. д.

Прывядзем найбольш характэрныя факты.

Саўгас «Каменка» — Сьвінаводу замест 117 рабочых паказаў у балянсе 304, замест 189 шт. жывёлы паказаў 260. У выніку, заяўка на збожжа-фураж павялічана на 1.876 цэнтн. Браніраваны насенны фонд павялічан на 131 проц.

Саўгас «Сержпутава» — Саўгастрэсту павялічыў нормы рабочым з 17,1 клгр. у месяц да 21,7 кгр. Колькасьць патрэбнай рабсілы павялічана на 130 чалавека-месяцаў. Патрэбнасьць жыта для рабочых павялічана на 372 цэнт.

Саўгас «Бярэзіна» Саўгастрэсту—фактычна ўбраная плошча жыта 32 гэкт., а ў балянсе паказана 27 гэкт. У часе праверкі намесьнік дырэктара саўгасу тав. Тур заявіў, што ўесь гарох прапаў і ў балянсе ён ня значыўся, а пры праверцы складаў аказалася, што маецца звыш 30 вазоў гароху. Патрэбнасьць па балянсе павялічана на 2994 цэнт. збожжа-фуражу.

Саўгас «Васільлеўск» Сьвінаводу павялічыў патрэбнасьць у аўсе на 21.037 цэнт.

Выключная наглясьць, «чоботвірательство» і яўнае ашуканьне партыі была праяўлена дырэкцыяй саўгасу «Вялень-Сінча» Сьвінаводу. Агульны балянс саўгасу прызнан камісіяй ЦКК РСІ нават перапаменшаным: па балянсе камісіі — 38.776 цэнт., па балянсе саўгасу—37.762 цэнт., але-ж саўгас за лік недапушчальна рэзкага скарачэньня ўдзельнай вагі вотрубей і макухі ў кармовым балянсе, павялічыў патрэбнасьць у аўсе і ячмені на 15.153 цэнт.

Кулацкі характар гэтых дзеяньняў, гэтых «клопатаў» аб «сваім» прадпрыемстве лепш за ўсё выяўляецца ў тым, што гэта буржуазна-рвацкая практыка амаль усюды **суправаджалася злачынай безгаспадарчасьцю.**

Праверка выявіла, што ў радзе саўгасаў з-за безгаспадарчасьці загінула многа аўса («Дашкаўка», «Прафінтэрн», «Сталіна», «Новыя Зяленькі»), што ў радзе саўгасаў ня было бальшавіцкай барацьбы за ўраджайнасьць («Вялень-Сінча», «Тарасава», «Новы шлях», «Добрынь» і г. д.).

Прэзыдыум ЦКК, абгаварыўшы вынікі праверкі, ужыў рэзкія меры да асоб, вінаватых у ашуканьні партыі і безгаспадарчасьці. Рад дырэктароў саўгасаў зьняты з работы, выключаны з партыі і адданы пад суд, рад з іх атрымаў суровыя меры спагнаньня.

Праверка выявіла, што гэта кулацка-рвацкая практыка раду саўгасаў ня толькі ня сустрэла бальшавіцкага адпору з боку адпаведных работнікаў цэнтральных апаратаў саўгаснай сыстэмы, Наркамзему, Наркамснабу, Саюзхлеба, але асобныя работнікі з цэнтральнага апарату па сутнасьці патуралі буржуазна-рвацкім тэндэнцыям у саўгасах. Бяссаўная дзейнасьць дырэктара саўгастрэсту тав. Грабенчыка ўжо выкрыта. Застаецца толькі дадаць, што затрыманьне плянаў збожжазагатовак было зусім не выпадковым. Уся лінія кіраўніцтва трэсту была накіравана на тое, каб утварыць наболыш ад дзяржавы. Чаго варты, напрыклад, цыркуляр Саўгастрэсту пры спуску плянаў саўгасам, у якім саўгасам дзецца паказаньне, што калі на працягу 10 дзён ня будзе з іх боку супярэчнасьцяй, тады трэст будзе лічыць плян прынятым. Што гэта, калі не прапанова дырэктарам трэстаў пярэчыць супроць збожжазагатоўчага пляну партыі і ўраду?

Буржуазна-рвацкія тэндэнцыі знайшлі свой адбітак у апараце Наркамзему і Наркамснабу. Ужо пасьля таго, як ЦК КП(б)Б рэзка асудзіў праваапартуністычную дзейнасьць дырэкцыі Саўгастрэсту, і прапанаваў Наркамзему забясьпечыць выкананьне саўгасамі збожжазагатоўчага пляну, скрытае супраціўленьне некаторых работнікаў Наркамзему ня было спынена. Разьвёрстка пляну збожжазагатовак была зроблена апаратам Наркамзему толькі 20-га лістапада і то пасьля энэргічных дамаганьняў кантрольных органаў.

Аб'яднаньне Наркамснабу, «Саюзхлеб», у просты абавязак якога ўваходзіць праверыць балянсы саўгасаў, не праверыў ніводнага балянсу і сумесна з дырэкцыямі саўгастрэстаў прапампаваў фіктыўныя балянсы раду саўгасаў.

Дырэктары саўгастрэсту, Саюзхлеба, адпаведныя работнікі Наркамзему і Наркамснабу, да рашэньня ЦК партыі, да праверкі, зробленай ЦКК РСІ, ня ўкарылі ні па адным канкрэтным посьбіце буржуазна-рвацкіх тэндэнцый у саўгасах, ня выкрылі ніводнага выпадку супраціўленьня кіраўнікоў пасобных саўгасаў збожжазагатоўкам. Гэта ў вялікай меры тлумачыцца тым, што ў цэнтральным апараце памянёных арганізацый прычакаліся пасобныя буржуазныя перараджэнцы, якія падтрымлівалі кулацкарвацкую практыку пасобных саўгасаў. Чым хутчэй яны будуць поўнасьцю выкрыты, тым лепш для справы.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б папрэдзіў рад кіруючых работнікаў гэтых арганізацый аб неабходнасьці ўмацненьня **сваёй клясава-партыйнай пільнасьці** на працягу 10 дзён ня будзе з іх боку супярэчнасьцяй, тады трэст будзе лічыць плян прынятым. Што гэта, калі не прапанова дырэктарам трэстаў пярэчыць супроць збожжазагатоўчага пляну партыі і ўраду?

Буржуазна-рвацкія тэндэнцыі знайшлі свой адбітак у апараце Наркамзему і Наркамснабу. Ужо пасьля таго, як ЦК КП(б)Б рэзка асудзіў праваапартуністычную дзейнасьць дырэкцыі Саўгастрэсту, і прапанаваў Наркамзему забясьпечыць выкананьне саўгасамі збожжазагатоўчага пляну, скрытае супраціўленьне некаторых работнікаў Наркамзему ня было спынена. Разьвёрстка пляну збожжазагатовак была зроблена апаратам Наркамзему толькі 20-га лістапада і то пасьля энэргічных дамаганьняў кантрольных органаў.

Аб'яднаньне Наркамснабу, «Саюзхлеб», у просты абавязак якога ўваходзіць праверыць балянсы саўгасаў, не праверыў ніводнага балянсу і сумесна з дырэкцыямі саўгастрэстаў прапампаваў фіктыўныя балянсы раду саўгасаў.

Дырэктары саўгастрэсту, Саюзхлеба, адпаведныя работнікі Наркамзему і Наркамснабу, да рашэньня ЦК партыі, да праверкі, зробленай ЦКК РСІ, ня ўкарылі ні па адным канкрэтным посьбіце буржуазна-рвацкіх тэндэнцый у саўгасах, ня выкрылі ніводнага выпадку супраціўленьня кіраўнікоў пасобных саўгасаў збожжазагатоўкам. Гэта ў вялікай меры тлумачыцца тым, што ў цэнтральным апараце памянёных арганізацый прычакаліся пасобныя буржуазныя перараджэнцы, якія падтрымлівалі кулацкарвацкую практыку пасобных саўгасаў. Чым хутчэй яны будуць поўнасьцю выкрыты, тым лепш для справы.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б папрэдзіў рад кіруючых работнікаў гэтых арганізацый аб неабходнасьці ўмацненьня **сваёй клясава-партыйнай пільнасьці.**

З усіх гэтых матар'ялаў павінны быць зроблены пэўныя палітычныя вывады.

Партыйныя ячэйкі ў саўгасах ва многіх выпадках аказаліся на вышыні сваіх задач. Яны ў большасьці не сыгналізавалі перад партыяй аб росквіце буржуазна-рвацкіх тэндэнцый. Характэрна, што ні ў адным з праверэных саўгасаў ні ячэйкі, ні прафэсыянальныя арганізацыі ня ставілі на абгаварэньне перад рабочымі збожжа-фуражных балянсы, ня ўцягвалі грамадзкасьць саўгасаў у барацьбу за збожжазагатоўчы плян.

Партыйная і прафэсыянальная работа ў саўгасах павінна быць раўнасільнай чынам перабудавана. У саўгасах нашталт прамысловага прадпрыемства, павінна весьціся штодзенная ўпартая барацьба за якасьць работы, за выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай і ў першую чаргу пляну збожжазагатовак.

Было-б вялікай памылкай думаць, што фашэньнямі ЦК і ЦКК вычэрпваецца барацьба з буржуазна-кулацкімі тэндэнцыямі ў саўгасах. Партыйныя арганізацыі на мясцох павінны ўзмацніць агонь па буржуазна-рвацкіх тэндэнцыях, па буржуазных скажэньнях прынцыпу гаспадарчага разрахунку, якой-бы форме яны не праявіліся, ці ў выглядзе фіктыўных збожжа-фуражных бал

Жорсткія баі на подступах Цзіньчжоу

ЦЯЖКАЯ АРТЫЛЕРЫЯ І БРОНЯЦЯГНІКІ ПУШЧАНЫ У ХОД

ТОКІЕ, 26. Японскі друк паведамляе, што ўчора на поўнач ад Цзіньчжуантая (па чыгунцы Гаўбанцзы-Інкоў) адбылася сутычка паміж японскімі войскамі і «бандытамі». З абодвух бакоў **прымалі ўдзел бронецягнікі.**

Па паведамленьні друку, учора «бандыты» напалі па ст. Фаньвэньчжэн (па Аньдун-Мукдэнскай чыгунцы) разбурылі палатно чыгункі і чыгуначны мост. Паміж «бандытамі» і японскімі войскамі адбыўся **жорсткі бой.**

Японскія **азраплены скінулі бомбы** паміж станцыяй Дава (па лініі чыгункі Гаўбанцзы-Інкоў) і Цзіньчжуантаем і **разбурылі вучастак чыгункі.**

Амэрыканскія ваенныя наглядальнікі паведамляюць, што ў часе апошніх паветраных нападаў японцы ўжывалі **бомбы спэцыяльнага тыпу.** Ад выбуху гэтых бомбаў стварыліся варонкі, **даўжнёю 12 футаў і 18 футаў у дыямэтры.**

***

БЭЙШІН, 25. Японская канцэсія ў Цзяньцзіне прадстаўляе сабою ўзмоцненую цытадэль. На межах паміж канцэсыяй і раёнамі кітайскай часткі гораду ўстаноўлены цяжкая артылерыя і кулямёты, зроблены дротавыя загародкі, праз якія прапушчан электрычны ток. 26-га ў Цзяньцзін прыбыў атрад японскіх войск у 1.800 салдат і 70 афіцэраў.

Японцы мабілізавалі рухомы склад, які належыць англічанам Бэйпін-Мукдэнскай чыгунцы, для перавозкі ў Цзяньцзін ваеннага атраду ў 2.000 чалавек.

Японскі імпэрыялізм рыхтуецца да далейшых дзеяньняў



На здымку: манэўры японскіх войск

Японія адхіляе ўмяшаньне імпэрыялістычных дзяржаў

ТОКІЕ, 25. Японскі ваенны міністар Аракі ў гутарцы рэзка крытыкаваў мэмарандум Францыі, Англіі і Амэрыкі адносна ваенных апэрацый Японіі ў Манчжурыі. Аракі заявіў, што гэта «ўмяшаньне», заснаванае на незнаёмасьці з фактамі **на спыніць ваенных дзеяньняў Японіі».**

Аракі ўказвае, што японцы не паступалі-б на Цзіньчжоў, калі-б цзіньчжоўскія войскі не знаходзіліся ў сувязі з «бандытамі». Гэтыя «бандыты», на словах Аракі, заўтра могуць быць залічаны ў кітайскія войскі, а салдаты кітайскіх войск лёгка могуць стаць «бандытамі». «Такім чынам, — сказаў Аракі, — практычна няма розьніцы паміж цзяньчжоўскімі салдатамі і «бандытамі».

Права забіваць кожнага кітайца

ШАНХАЙ. Цзіньчжоўскі ўрад абвінавачвае японцаў у арганізацыі, у фінансаваньні і снабжэньні зброяй вялікай колькасьці «бандытаў». «Бандыты» неабходны японцам для таго, каб стварыць прычыну для нападу на Цзіньчжоу. Цзіньчжоўскі ўрад паказвае, што да японскай акупацыі колькасьць «бандытаў» у раёне Цзіньчжоў была зусім нязначнай, а цяпер іх налічваецца звыш 80.000. «Японцы, — заяўляе цзіньчжоўскі ўрад,— глядзяць на ўсё кітайскае насельніцтва, як на «бандытаў». Таму яны лічаць, **што маюць права забіваць кожнага кітайца».**

Японскія войскі перайшлі раку Ляо

ТОКІЕ. Японскія войскі ўчора перайшлі раку Ляо і спыніліся пакуль у Цзяньчжуантаі (на поўнач ад Інкоў). Часьці 10-й дывізіі накіраваліся ў гэты раён.

„Парадак" акупантаў у Манчжурыі

БЭЙПІН. Амэрыканскі орган «Пэкін Лідэр» асьвятляе пытаньне аб захопе Манчжурыі японцамі. Газэта ўказвае, што **японцы закрываюць японскія банкі, грабяць кітайскія памяшканьні, захватваюць каштоўнасьці, а таксама і дакументы на права ўладаньня зямлёй, перадаючы іх у рукі японцаў, канфіскуюць мільёны даляраў, захапілі Мукдэнскі арсэнал, узбраеньні і амуніцыю для таго, каб пачаць наступленьне супроць кітайцаў.**

Газэта піша: «Японскія разбойнікі, калі яны сапраўды жадаюць пазбавіцца бандытаў, павінны змагацца ў першую чаргу супроць саміх сябе, перш чым іх уласныя дзеяньні з відавочнасьцю не дакажуць, што яны **іменна зьяўляюцца сапраўднымі бандытамі».**

"Кельніше цэйтунг" аб перагаворах СССР з яго заходнімі суседзьмі

БЭРЛІН, 25 сьнежня. Пад загалоўкамі «Праз пакты аб ненападзе да разазбраеньня» і «Значны крок да міру» маскоўскі карэспандэнт **«Кельніш цэйтунг»** паведамляе аб перагаворах СССР з яго заходнімі суседзьмі наконт пакту аб ненападзе.

Карэспандэнт заяўляе, што паводле сабраных ім неафіцыяльных вестак ужо ёсьць значнае збліжэньне савецкага і польскага пунктаў гледжаньня і што нельга больш пасьля прамовы т. Молатава сумневацца ў пачатку перагавораў з іншымі суседзьмі СССР. Стараньні ўсіх бакоў, — гаворыць карэспандэнт, — накіраваны да таго, каб ажыцьцявіць гэту справу міру яшчэ да міжнароднай канфэрэнцыі па разазбраеньні.

Падкрэсьліваючы далей, што СССР вядзе асобныя перагаворы з Румыніяй і Эстоніяй, карэспандэнт заяўляе, што адсюль трэба зрабіць вывад аб адмаўленьні Польшчы ад яе старога патрабаваньня аб сумесным заключэньні пактаў аб ненападзе паміж СССР, з аднаго боку, Польшчай і прыбальтыцкімі дзяржавамі — з другога. «Гэта патрабаваньне, — кажа карэспандэнт,— заўсёды адхілялася савецкай дзяржавай, як недапушчальны «притязания» Польшчы на гегемонію ў прыбальтыцкім блёку».

Карэспандэнт гаворыць далей, што ні абазначэньствы, зьвязаныя з прыналежнасьцю да Лігі нацый, ні пытаньне аб трацейскім разгляде ня могуць больш служыць затрудненьнем для Польшчы і прыбальтыцкіх дзяржаў пасьля таго, як абодва гэтыя пытаньні вырашаны ўжо ў франка-савецкім пакце аб ненападзе. «Але тым самым ліквідаваны ў карысьць СССР усе тры важнейшыя патрабаваньні Польшчы, якія яна высоўвала, пачынаючы з 1925 году, і якія ўвесь час перашкаджалі прагрэсу перагавораў паміж Масквой і Варшавай».

У канцы карэспандэнт выказвае меркаваньне, што СССР праявіў пэўную гатоўнасьць пайсьці насустрач другому боку і што за парафаваньнем польска-савецкага дагавору вельмі хутка могуць пасьледаваць дагаворы з Эстоніяй і Фінляндыяй. Па сутнасьці, — гаворыць карэспандэнт, — цікавасьць мае толькі разьвіцьцё перагавораў з Румыніяй.

Грандыёзная антыфранцуская дэманстрацыя ў Дамаску

СТАМБУЛ. Паводле паведамленьня з Дамаску, пахаваньне 60 расстраляных ператварылася ў грандыёзную анты-французскую дэманстрацыю, у якой прыняло ўдзел да 60 тыс. чал. Па ўсёй краіне арыгты працягваюцца. У Дамаску вуліцы наводнены сэнэгальскімі стральцамі. Мясцовая паліцыя і жандармерыя дзейнічаюць пад камандаваньнем французскіх афіцэраў. Магазыны зачынены. Рух на вуліцах спынёўся. Урад баіцца агульнага паўстаньня. З Алепо паведамляюць, што ў дэманстрацыі забіта 12 чалавек.

Ваяізацыя жанчын у фашысцкай Польшчы

Пуск магнітагорскага кокса-хэмічнага камбінату

МАГНІТАГОРСК. Магнітагорскі кокса-хэмічны камбінат першым з гігантаў Урала-Кузбасу ўступіў у строй дзейных прадпрыемстваў 26-га сьнежня ў 9 гадзін 15 хвілін.

Дазатар (загрузачны вагон) прыняў з бункераў турмы першую дозу вугальнай шыхты. Пад кіраўніцтвам машыніста Такарэвіча дазатар прайшоў па рэйках, пракладзеных па версе батарэй, і спыніўся над чацьвертай печаю (парадак загрузкі адрозьніваецца ад парадку знаходжаньня печаў). З трох варонак дазатара, якія прыходзяцца над трыма покамі печы, шыхта была загружана ў сярэдзіну. Тады пад кіраўніцтвам машыніста Чыжмой да батарэі падышоў кокса-выштурхвальнік. Планір гэтага «коксавага камбайну» выраўняў створаныя ў сярэдзіне печы конусныя кучы шыхты ў суцэльную масу. Пасьля гэтага былі гермэтычна зачынены дзьверцы печы. Апальваньне вугалю — каксаваньне пачата. Першай зьменай эксплёатацыйнікаў, якая загрузіла печы, кіраваў зьменны інжынэр — камсамолка тав. Пэўзнэр. Праз 36 гадзін штанга коксавыштухвальніка выштурхне першы «коксавы пірог». Сьледам за чацьвертай печчу загружаны, згодна пускавога графіку, усе 69 печаў першай батарэі вялізарнейшага ў Эўропе магнітагорскага кокса-хэмічнага камбінату.

***

Сёньняшняя тэлеграма з Магнітагорска паведамляе аб новай перамозе на фронце соцбудаўніцтва: увайшоў у строй Магнітагорскі кокса-хэмкамбінат—адзін з «518».

Старшыня «Востокококса» тав. Варапаеў, які надаўна наведаў Магнітагорск, у сувязі з гэтым заявіў:

— Уступаючы ў строй дзейных прадпрыемстваў Магнітагорскі кокса-хэмкамбінат адзначаецца ня толькі тым, што забясьпечвае коксам Магнітагорскі мэталюргічны завод — ён зьяўляецца таксама вялізарнай перамогай усёй прамысловасьці СССР.

У строй уступае ня толькі вялізарнейшая ў Эўропе ўстаноўка, але ўстаноўка, якая стварыла новыя мэтады працы, падрыхтавала новыя кадры для далейшага будаўніцтва кокса-хэмічных установак.

Амэрыканцы патрабавалі на кладку коксавых печаў 5 месяцаў часу. Мы ўстанавілі тэрмін у 3 месяцы. Але ўдарнай работай усяго калектыву рабочых кокса-хэмкамбінату мы і гэты кароткі тэрмін скарацілі да 67 дзён.

Магнітагорцы павінны перанесьці свой вопыт на Кэмэраўскае, Тагільскае і Губаінскае будаўніцтвы. Дасягнутыя тут сусьветныя вытворчыя рэкорды і мэтады зімовага бэтанаваньня, якіх дабіліся магнітагорцы, павінны стець эдабыткам усёй рабочай клясы Савецкага Саюзу. Апошняя асабліва важна, бо тэмпы разьвіцьця коксахэмічнай прамысловасьці не дазваляюць нам выкрэсьліваць зіму з рабочага часу.

Вопыт Магнітагорскага коксахэму паказаў таксама поўную магчымасьць пры ўмелай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў вырабляць асноўныя мантажныя канструкцыі непасрэдна на будаўнічай пляцоўцы.

Пабудова Магнітагорскага коксахэму — рэзультат ударнай работы паўтары тысячы будаўнікоў — выхавала кіраўнікоў-ударнікаў. Імёны маладых інжынэраў: Тамаркіна, Эйдзінава, Бапанудзе, Пасоўскага, Ніжэвіча, тэхніка Парыскага і брыгадзіраў: Мазэтава, Гемірына, Калмыкова, Пракопенні, Кізікава і Мартынава вядомы ўсяму Саюзу.

Перамогі, якіх дасягнулі магнітагорцы, зьяўляюцца першай зарукай да пасьпяховага завяршэньня будаўніцтва ўсяго Магнітагорскага камбінату, усяго Урала-Кузбасу.

НІ АДНАГО ПАДПІСЧЫКА БЕЗ ЗАМАЦАВАЛЬНЫХ ТАЛЁНАЎ „ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА"

Старшыня цэнтральнай камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры прэзыдыуме ЦВК СССР тав. **Чуцкаеў** зьвярнуўся да ўсіх працоўных з адозвай, у якой гаворыцца:

Паводле вестак цэнтральнай камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту далёка ня ўсе падпісчыкі пазыкі ўжо маюць на руках свае замацавальныя талёны: у радзе выпадкаў крэдытныя ўстановы яшчэ зусім не замацавалі аблігацый за калектывамі: ня мала выпадкаў, калі замацавальныя талёны, атрыманыя ад крэдытных устаноў ляжаць у сталох прадпрыемстваў і ўстаноў.

Усе рабочыя і калгаснікі павінны ўзьдзейнічаць на свае камісіі садзейнасьці, на адміністрацыю, на фінкрэдытны апарат, каб усе падпісчыкі былі забясьпечаны замацавальнымі талёнамі.

Да першага тыражу пазыкі «3-га рашаючага» — ні аднаго падпісчыка без замацавальных талёнаў.

ШТУЧНЫ ШОЎК З БАВАУНЯНАЙ ШАЛУХІ

МАСКВА. Вопыты Маскоўскага інстытуту маргарынава-маслабойнай прамысловасьці, якія рабіліся пад кіраўніцтвам інжынэра **Чатвярыкова,** паказалі магчымасьць атрыманьня з баваўнянай шалухі цэлюлёзы **для выробу штучнага шоўку.**

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае, што, ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, гаспадарчыя, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі чыгунак ня ўлічылі сур'ёзнасьці ліквідацыі абязьлічкі ў вагонным парку і не правялі ўсіх практычных мерапрыемстваў, вызначаных пленумам па арганізацыі двухбаковага абмену вагонаў на дарогах. У выніку да гэтага часу некаторыя абменныя пункты **(Магілеў, Калінкавічы)** не забясьпечаны вытворчымі і службовымі памяшканьнямі. Пункты абмену і рамонту не ўкамплектаваны неабходнай кваліфікаванай рабсілай. Дырэкцыі дарог не забясьпечылі бесьперабойнага снабжэньня абменных пунктаў запаснымі часткамі і матар'ыяламі. У выніку ўсяго гэтага абменныя пункты за мест сапраўднага аздараўленьня вагоннага парку ў значнай меры фармальна фіксуюць недахопы ў вагонах і нагрузцы. Ёсьць недапушчальныя моманты затрыманьня цягнікоў з-за несваячасовага рамонту вагонаў і невыкананьня ў тэрмін іншых апэрацый на абменных пунктах.

Сакратарыят ЦК пастанаўляе:

1. Прапанаваць начальнікам раёнаў і кіраўніком абменных пунктаў зьнішчыць затрыманьні цягнікоў на пунктах абмену звыш паложанага часу.

2. Абавязаць нач. раёнаў у дэкадны тэрмін укамплектаваць абменныя і рамонтныя пункты неабходнай кваліфікаванай рабсілай.

У мэтах павышэньня кваліфікацыі работнікаў і падрыхтоўкі кадраў для абменных і рамонтных пунктаў арганізаваць кароткатэрміновыя курсы без адрыву слухачоў ад вытворчасьці.

3. Абавязаць нач. раёнаў і дэпо ў мэтах палягчэньня работы абменных пунктаў узмацніць рамонт і агляд вагонаў у пунктах фармаваньня цягнікоў і на распарадчых станцыях.

4. Прапанаваць нач. раёнаў неадкладна прадаставіць памяшканьні абменным пунктам для рамонту вагонаў і правядзеньня апэрацый па абмене.

5. У мэтах максымальнага скарыстаньня ўнутраных рэсурсаў для рамонту вагонаў абавязаць нач. раёнаў і кіраўнікоў абменных і рамонтных пунктаў арганізаваць утылізацыйныя брыгады па скарыстаньні і рамонце адыходаў ад старых матар'ялаў.

6. Абавязаць нач. раёнаў, усе партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі чыгункі зараз-жа прыступіць да пераводу на зьдзелышчыну ўсёй работы па абменных і рамонтных пунктах.

Разгарнуць сацспаборніцтва за якасьць рамонту вагонаў і выкананьне ўсіх апэрацый на абменных пунктах у вызначаныя тэрміны.

Неабходна павесьці масавую работу сярод рабочых, шырока асьвятляць работу абменных пунктаў у друку у сувязі з конкурсам на лепшы абменны пункт, з тым, каб па - сапраўднаму мабілізаваць масы на аздараўленьне вагоннага парку і павышэньне работы чыгунак.

Закрыўся ўсебеларускі зьезд Аўтадору

27-га сьнежня закрыўся 1-шы Ўсебеларускі зьезд таварыства Аўтадор.

Зьезд пастанавіў прыняць шэфства пад пагранвартай БССР, стварыць шэфскі фонд і ўзяў на сябе рад абавязацельстваў па культурным абслугоўваньні пагранічнікаў.

У сучасны момант у БССР налічваецца звыш 70.000 членаў Аўтадору. Зьезд паставіў задачу перад аўтадораўскімі арганізацыямі рэспублікі — да канца 1932 г. уцягнуць у актыўную барацьбу за культурную дарогу і савецкі аўтамабіль, у якасьці членаў т-ва, ня менш 200.000 рабочых, калгаснікаў. Таварыства павінна асноўны ўпор рабіць на барацьбе з бездарожжам.

За лепшае правядзеньне месячніка штурму прарываў у дарожным будаўніцтве прэміяваны: Бярэзінскі РВК — двума трактарамі, Полацкі Аўтадор — легкавым аўтамабілем і рад раёнаў — ганаровымі граматамі. Найбольш актыўныя ўдзельнікі штурму прэміяваны вялёсыпедамі, гадзіньнікамі і скуранымі гарнітурамі.

У склад новага Цэнтральнага Савету Аўтадору БССР выбраны т. т.: **Гаруновіч** (старшыня), **Ірбінік** (пам. старшыні), **Гордзін** (адказны сакратар).

На Ўсесаюзны зьезд Аўтадору, які адбудзецца ў Маскве 5-га студзеня 1932 г., ад БССР едзе дэлегацыя ў складзе 15 чал. (БЕЛТА).

„Зьвязьдзе"— ад Бярэзінскай райпартканфэрэнцыі

Змагару за генэральную лінію партыі, нястомнаму барацьбіту за ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК — газэце «Зьвязда» шчырае бальшавіцкае прывітаньне ад Бярэзінскай райпартканфэрэнцыі.

Адзначаючы вялізарную ролю «Зьвязды» ў справе дапамогі партарганізацыі рабу на практыцы ажыцьцяўляць дырэктывы ЦК па сацыялістычным будаўніцтве, канфэрэнцыя ўпэўнена, што і надалей «Зьвязда» будзе зьяўляцца адным з лепшых дапаможнікаў партыйнай арганізацыі ў справе ажыцьцяўленьня задач, пастаўленых перад намі партыяй.

Няхай жыве ЦО КП(б)Б — «Зьвязда»!

ПРЭЗЫДЫУМ КАНФЭРЭНЦЫІ.

Папраўкі

З ПРЫЧЫНЫ МОЦНЫХ АТМАСФЭРНЫХ РАЗРАДАЎ І ДРЭННАЙ РАБОТЫ ТАСС ПА ЗЬВЕРЦЫ ДАКЛАДУ ТАВ. МОЛАТАВА ПА ТЭЛЕФОНУ, У ДАКЛАД УКРАЛІСЯ НАСТУПНЫЯ ПАМЫЛКІ:

У нумары «Зьвязды» ад 26 сьнежня ў дакладзе тав. Молатава аб народна-гаспадарчым пляне дапушчаны памылкі. У разьдзеле I «СССР і капіталістычныя краіны ў мінулым годзе», у першай калёнцы, 5-м абзацы, 7-м радку зьверху надрукавана: «Вываз зьнізіўся...», трэба чытаць: «Увоз зьнізіўся...».

У другой калёнцы гэтага-ж разьдзелу, у 3-м абзацы, 20-м радку зьверху надрукавана: «Але ня толькі ў Германіі — краіне пераможнай — крызіс робіць...», трэба чытаць: «Але ня толькі ў Германіі — краіне пераможанай — крызіс робіць...».

У разьдзеле II «Пяцігодка за чатыры гады», 3-й калёнцы, 3-м абзацы, 25-м радку зьверху надрукавана: «Прыведзеныя тут жапоўныя даныя аб прамысловай прадукцыі адносяцца толькі да кола прамысловых галін, уключаных у планы (1926-27 году)», трэба чытаць: «Толькі што прыведзеныя даныя аб прамысловай прадукцыі, як ужо сказана, адносяцца толькі да кола прамысловых галін, уключаных у пяцігадовы план (па цэнах 1926-27 году)».

У гэтым-жа разьдзеле і абзацы, 32-м радку, надрукавана: «Частка лесазагатовак, лясная, мукамольна-крупяная і г. д.», трэба чытаць: «Частка лесазагатовак, мясная, мукамольна-крупяная і г. д.».

У разьдзеле «Пяцігодка сельскай гаспадаркі», у 2-й калёнцы, другі абзац зьнізу трэба чытаць: «Далей, як выконваецца пяцігодка па павялічэньні пасеўнай плошчы: заданьне пяцігадовага пляну аб дасягненьні да канца пяцігодкі **141 млн.** га пасеваў выконвалася за першыя тры гады з посьпехам. Мы ўжо дасягнулі па пасеўных плошчах **137,5 млн.** га і г. д.».

У разьдзеле «Пяцігодка па працы і быце працоўных» у 1-м абзацы, 23-м радку надрукавана: «У 4-м годзе пяцігодкі гэта лічба дасягае 6,5 млн. Значыць у адносінах непасрэдна індустрыяльных кадраў мы выконваем пяцігодку на 52 проц.», трэба чытаць: «У 4-м годзе пяцігодкі гэта лічба дасягне **6,2 млн.** Значыць, у адносінах непасрэдна індустрыяльных кадраў мы выконваем пяцігодку на **152 проц.**».

У гэтым-жа разьдзеле, 3-яй калёнцы, 2-м абзацы зьверху, 4-м радку зьнізу надрукавана: «На паступны год бюджэт сацыяльнага страхаваньня дасягае 3,940 млн. рублёў», трэба чытаць: «На паступны год бюджэт сацыяльнага страхаваньня дасягае **3.490** млн. руб.».

У разьдзеле «Аб агульных выніках і вораках пяцігодкі», 2-м абзацы 3-м радку зьнізу надрукавана: «... за 4 гады супроць 58,8 млрд. рублёў», трэба чытаць: «... за 4 гады супроць **53,8** млрд. руб.».

У гэтым-жа разьдзеле, 3-й калёнцы, 3-м абзацы, 11-м радку зьнізу надрукавана: «... у адказ на апартуністычныя сумненьні ў рэалізацыі пастаўленых заданьняў», трэба чытаць: «... у адказ на апартуністычныя сумненьні ў рэальнасьці пастаўленых заданьняў».

У разьдзеле III «Задачы моманту» 2-ой калёнцы, 2-м абзацы, 15-м радку зьнізу надрукавана: «... зьяўляюцца самымі надзейнымі пытаньнямі», трэба чытаць: «... зьяўляюцца самымі **надзеннымі** пытаньнямі».

У гэтым-жа разьдзеле, 3-яй калёнцы, 4-м абзацы зьнізу, 10-м радку зьнізу надрукавана: «Загатоўкі ільну, пяньку, ільнавалакна» і г. д., трэба чытаць: «Загатоўкі птушкі, пяньку, ільнавалакна» і г. д.

У разьдзеле IV «Аб міжнародным становішчы і барацьбе за мір» у 1-ай калёнцы, 3-м абзацы, 7-м радку зьнізу надрукавана: «Каб пастаўць пытаньне аб пераключэньні гэтых пунктаў аб ненападзе на рэйкі практычнага ажыцьцяўленьня», трэба чытаць: «Каб паставіць пытаньне аб заключэньні гэтых пунктаў аб ненападзе на рэйкі практычнага ажыцьцяўленьня».

У гэтым-жа разьдзеле ў 4-ай калёнцы, 2-м абзацы, 4-м радку зьверху надрукавана: «Мы адказваем на гэта ўзмоцненьнем будаўніцтва і перш за ўсё тым, што змагаемся ўжо ў 1932 годзе за скончэньне пяцігодкі», трэба чытаць: «Мы адказваем на гэта ростам сацыялістычнага будаўніцтва і перш за ўсё тым, што **бяромся** ўжо ў 1932 годзе закончыць пяцігодку».

У «Зьвязьдзе» № 341, ад 25 сьнежня, у артыкуле «Агонь па ўхілістах да вялікадзяржаўнага шавінізму», у 5 калёнцы, 3-ці абзац зьверху па віне друкарні надрукавана: «Але гэта не паслужыла сыгналам для ўзмацненьня работы па мабілізацыі партыйных мас на змаганьне з ажыцьцяўленьнем нацыянальнай палітыкі партыі». **ПАВІННА БЫЦЬ: «Але гэта не паслужыла сыгналам для ўзмацненьня работы па мабілізацыі партыйных мас НА ЗМАГАНЬНЕ за ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі».**

У № 343 «Зьвязды» ў пастанове ЦК КП(б)Б ад 28 сьнежня аб палітычнай памылцы газэты «Орка» па тэхнічных прычынах укралася прыкрая апячатка. У другім пункце надрукавана: «Абавязаць цэнтральны і раённы друк БССР узмацніць на сваіх старонках барацьбу з выкрыцьцём трацкісцкай кантрабанды» і г. д., трэба чытаць: «узмацніць на сваіх старонках барацьбу **за выкрыцьцё** трацкісцкай кантрабанды».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Менгарком КП(б)Б 31-га сьнежня г.-г. у 7 гадз. вечара, у памяшканьні Гаркому (заля пасяджэньняў, 3-ці паверх) СКЛІКАЕ

агульна-гарадзкую нараду рэдактароў шматтыражных газэт, штодзённак і членаў рэдкалегій.

З ПАРАДКАМ ДНЯ: падрыхтоўка да 2-ой партканфэрэнцыі, 14-га зьезду КП(б)Б і 17-ай канфэрэнцыі УсеКП(б) і задачы нізавога друку.

Даклад тав. **Кавальчука.**

Яўка абавязкова і без спазьненьня.

Менгарком КП(б)Б.

Паведамленьні

— 29 сьнежня, у 7 гадз. веч., у памяшк. інстытуту камвыхаваньня (Унівэрсытэцкі гарадок, прыродазнаўчы корпус, пакой № 115) адбудзецца сход таварыства педагогаў-марксыстаў. Запрашаюцца: члены т-ва дыялектыкаў-матэрыялістаў, пастаўнікі. Яўка членаў т-ва абавязкова. Парадак дня: 1) Працяг абгаварэньня ліста тав. Сталіна і задачы педагагічнай навукі. 2) Перарэгістрацыя членаў т-ва.

— **Дом Працасьветы.** 29-XII—31 г., у 7 гадз. веч., адбудзецца партыйна-камсамольскі сход калектываў працасьветы. Парадак дня: 1) Працяг абгаварэньня ліста тав. Сталіна. Даклад тав. Панкавіча. Запрашаюцца ўсе асьветнікі г. Менску.

— 29-XII—31 г., у 7 гадз. веч., у залі Акадэміі Навук адбудзецца працяг сходу па абгаварэньні ліста тав. Сталіна. Яўка ўсіх партыйнаў абавязкова.

— Культпроп ЦК КП(б)Б скліча 30-XII—31 г., у 12 гадз. дня (у пакоі № 16), нараду па пытаньні аб навукова-навучальнай літаратуры. На нараду выклікаюцца т. т. Бэндэ, Ліманоўскі, асьпіранты па літаратуры і жадаючыя камуністы-шісьменьнікі.

— Культпроп ЦК КП(б)Б скліча 1.I 1932 г., у 5 гадз. веч. (у пакоі № 16) нараду камуністаў, якія працуюць у галіне тэатру (рэжысэры, акторы, адміністрацыйныя працаўнікі і г. д.) для абмеркаваньня тэатральнага дакуманту РАПП. Яўка абавязкова.

30 СЬНЕЖНЯ, У 6 ГАДЗ. ВЕЧ., У КЛЮБЕ МЭТАЛІСТАЎ АДБУДЗЕЦЦА

КУСТАВЫ СХОД ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ:

завод „Ударнік", Электрастанцыя, Водаканал, ЦІП, УЭЛ, ПЭЦ, Трансвартрэст, Наркамсьветы, Белторф, рэдакцыі газэт, ЦК КП(б)Б і ЦКК КП(б)Б. Даклады Гаркому і Гар. КК КП(б)Б.

Дакладчыкі т. т. ШУЛЬКІН і КАВАЛЁЎ.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў абавязкова.

Партколектыў рэдакцыйны газэт і друкарні „Зьвязда".

Кіно-тэатр „Чырв. Зорка" Ад аўторка, 29 сьнежня

Аднаўляецца пастаянай лепшы гукавы мастацкі фільм

ВЫТВОРЧ. ЛЕНІНГР. Ф-КІ САЮЗКІНО.

Златыя горы

Аўтары: рэж.—С. Юткевіч. кампаз. Д. Шастаковіч.

У гал. ролях: засл. арт. Мэрвін-Крыжоўскі, Разумава, Штраух, Тэнін, Мічурын і Паслаўскі.

Пачатак сэансаў у 6 г., 8-20 і 10-30

Каса—ад 1 гадз. дня

ДЗЕЦІ Ў КІНО НЕ ДАПУСКАЮЦЦА.

„Культура" Пач.: 7, 8-40, 10-30 — З карціны ў адзін сэанс: 1) Дальфін белабокі 2) Ціхан Океанскі 3) Цёмныя ночы

„Інтэрнацыянал" — Савецкі фільм выт. Саюзкіно **Чалавек за бартом** Каса адкрыта ад 12 г. дня

„ПРАЛЕТАРЫ" Пач. у 2 г. дня — Мастацкі фільм **БЕЛЫ КОНЬНІК** (Бог вайны)

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Новы мастацкі фільм **ПА КОНГО** у 5 ч. Пач. 1г., 2-30. Каса—ад 11 г. дня.

„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 Каса—ад 5 гадз. — Сёньня вядомы фільм **„Коллежский регистратор"** У гал. ролі вядомы артыст **Масквін.**

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ і Менскае Гарадзкое аддзяленьне

31 сьнежня г. г. у сувязі з замкненьнем галоўнай справаздачы

БАНК для ўсіх БУДЗЕ ЗАЧЫНЕН

Дакладнасьць да ведамы, што Бачэрная каса працуе ў звычайныя гадзіны. Беларуская кантора Дзяржбанку. і Менскае Гарадзкое аддзяленьне.

НА СТУДЗЕНЬ

можна яшчэ выпісаць газэту „ЗЬВЯЗДА".

Менгарбюро саюздруку працягнут ПРЫЁМ падпіскі на газэту «ЗЬВЯЗДА» ДА 30-га СЬНЕЖНЯ выключна па абанімэнтнай сыстэме з атрыманьнем газэты ў любым кіёску саюздруку Менгарбюро.

31 СЬНЕЖНЯ Г. Г. БУДУЦЬ ЗАКРЫТЫ

Гарадзкая каса № 16, паведамляе ўсіх абнонтаў, што у сувязі со складаньнем галоўнай справаздачы на 1931 г. і пачаткам працы на 1932 г. усе вымаганьні г. Менску

31 сьнежня г. г. будзе закрыта і апэрацыі ўтварэньня на будучыня.

Гарадзкая каса № 16.

Пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР адбудзецца

29 сьнежня, у 7 гадз. веч., у памяшканьні ЦК МОПР'у.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Справаздача 2-х вайсковых арганізацый МОПР'у (Менск і Быхаў) аб сваёй дзейнасьці.
2. Даклад Юнацкага сэктару Мен. ГК МОПР'у аб рабоце сярод ЮПМ.
3. Справаздача рэдкалегіі газэты „МОПР".
4. Аб перамыбарчай кампаніі нізавых органаў МОПР'у.
5. Розное.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў ЦК і прэзыдыуму— абавязкова.

Запрашаецца гарадзкі актыў.

Сакратар ЦК МОПР'у БССР Цудзін.

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 2-гі набор 6-ці месячных КУРСАУ ПЛЯНАВІКОЎ і кіруючых, вучотна-апэрацыйных працаўнікоў Дзяржбанку у г. Менску.

На курсы прымаюцца члены КП(б)Б і КСМ, якія маюць 2-хгадовы стаж кіруючай работы раённага маштабу, або самастойнай работы ў крэдытным сыстэме, з дастатковай агульна-адукацыйнай падрыхтоўкай (на кіруючы-плянавы цыкль) і да 30 проц. беспартыйных, якія апраўдалі сябе на грамадзкай рабоце, і маюць адукацыю ня ніжэй семігодкі і дастатковы стаж бухгальтарскай работы. (На вучотна-апэрацыйны цыкль).

За прынятымі на курсы таварышамі захоўваецца стыпэндыя ў разьмеры акладу пэнсіі і акрамя гэтага сямейныя атрымліваюць сутачныя да 2 р. 50 к., стыпэндыя—мінімум устанаўляецца ў 100 рублёў.

Акрамя гэтага курсанты атрымліваюць фактычныя выдаткі на праезд у г. Менск, дармовы інтэрнат і харчаваньне ў сталоўцы за свой кошт.

Зьдічныя курсанты даюць падпіску аб працы ў сыстэме Дзяржбанку на працягу 2-х год пасьля сканчэньня курсаў.

Падрабязныя ўмовы прыёму на курсы ёсьць ва ўсіх аддзяленьнях Дзяржбанку і ў аддзеле кадраў канторы (Менск, Рог Савецкай і Ленінскай вул., 3-ці паверх, тэлефон № 17-31), дзе магчыма атрымаць анкеты і праз якія патрэбна дасылаць усе дакументы.

Апошні тэрмін падачы заяў 10-га студзеня 1932 г.

Усебелкантора Дзяржбанку.

Беларускі Будаўнічы і Энэргетыч. інстытуты сумесна з рабфакамам будаўнікоў Дому Ўраду адкрываюць 4-хмесячныя падрыхтоўчыя курсы ДА ВЕСНАВОГА НАБОРУ 1932 г. У БУДАЎНІЧЫ І ЭНЭРГЕТЫЧНЫ ІНСТЫТУТЫ.

На курсы прымаюцца выключна рабочыя ня менш чым з 3-гадовым вытворчым стажам, якія скончылі школы для дарослых узвышанага тыпу, прафтэхшколы на базе 4-х і 5-ці годкі і наогул маюць адукацыю ня ніжэй 8-мі груп дзевяцігодкі.

Жадаючыя паступіць на курсы падаюць дакументы аб узросьце, асьвеце, вытворчым стажы і завераныя анкеты ў канцылярыю інстытутаў (рог Унівэрсытэцкай і Чырвонаармейскай вул. д. № 42-8), ці ў рабфак Дому Ураду да 1 СТУДЗЕНЯ 1932 г.

Заняткі на курсах пачнуцца 3 СТУДЗЕНЯ 1932 г.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТАЎ. РАБФАК ДОМУ ЎРАДУ.

ДЗЯРЖБАНК даводзіць да ведамы насельніцтва, што ім АДКРЫТ ПРЫЁМ ад полісатрымальнікаў ПОЛІСАУ амэрыканскага страхавога таварыства „Н'ю-Ёрк" для атрыманьня па імгрошай у Амэрыцы і выдачы іх уладаром полісаў як грашыма, так таварам з фондаў „ТОРГСІНУ". За ўсімі паведамі па гэтым пытаньні належыць зварачацца ў замежны аддзел Дзяржбанку. Прыём полісаў квітоў страхавых узносаў будзе праводзіцца Дзяржбанкам **толькі да 1-га лютага 1932 г.**

Дзяржбанк Беларуская контора.

Сёньня 29-XII у 4 гадз. дня адбудзецца пахаваньне жонкі б. чырвонага партызана ЛІПАВАЙ ЗОСІ

Выкас цела з Анатамічнага габінету Унівэрсытэцкага гарадка.

ПАЧАТ ПРЫ